**Леанід Трубач**

# Паміж песняй і болем

Выбраныя творы

**Мінск**
**“Кнігазбор”**
**2010**

Укладанне і прадмова
Сяргея Чыгрына

Леанід Трубач (1963-2009) пражыў толькі 46 гадоў, але пакінуў шчыры і прыкметны след у беларускай літаратуры і педагогіцы. У гэту кнігу ўвайшло ўсё лепшае, напісанае ім за гады ягонага кароткага жыцця, апублікаванае і неапублікаванае раней.

Кніга выдадзена пры фінансавай падтрымцы аднакурснікаў-філолагаў Леаніда Трубача, выпускнікоў Белдзяржуніверсітэта 1985 года.

## Зерне збіраўся сеяць вясной

Цяжка паверыць, што няма ўжо ў Паставах Леаніда Трубача. Няма нашага аднакурсніка, сябра, філолага, педагога і, вядома ж, цудоўнага паэта. Невылечная хвароба 46-гадовага мужчыну скасіла вельмі хутка. Таму не верыцца, што Лёнька (мы так яго ўсе называлі) не патэлефануе, не прыедзе на сустрэчу аднакурснікаў, не прачытаем мы ў друку ягоных вершаў і педагагічных разважанняў.

Я шмат разоў збіраўся напісаць прадмову да гэтай кнігі — не атрымліваецца, не пішацца, не выходзіць. Пры жыцці я б яму нагаварыў бы шмат кампліментаў і заўваг, а вось цяпер рабіць гэта цяжка, бо Лёні няма. Няма, а чуецца яго голас, бачыцца яго ўсмешка, згадваецца наша сумеснае студэнцкае жыццё. Вясёлае, цікавае, творчае... Лёнька ж быў сярод нас, юнакоў-філолагаў, самы малады, ён паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта адразу пасля школы. І ў школе, і ў БДУ ён вучыўся добра, быў даволі адукаваным юнаком. Памятаю, як на першым курсе выкладчыкі вырашылі праверыць, ці здольныя студэнты паступілі на філфак. І ў кожнай групе вырашылі напісаць дыктоўку па рускай і беларускай мовах. З юнакоў лепш за ўсіх напісаў Лёня. Асабліва па рускай мове. Мы хлопцы нарабілі столькі памылак, што нават сорамна пра гэта

сёння згадваць. Лёнька зрабіў толькі дзве памылкі, адна з іх была па пунктуацыі.

Пазнаёміўся я з ім на першым курсе ў 1980-м годзе. Мы разам засяліліся ў адзін 704 пакой у студэнцкім інтэрнаце на Кастрычніцкай вуліцы ў Мінску. І ўсе гады пражылі разам у адным блоку, які складаўся з двух пакояў. Гэта былі самыя шчаслівыя гады нашага жыцця, хаця час быў не просты, як для беларускай культуры, так і для краіны ў цэлым. У вольны час мы наведвалі Нацыянальную бібліятэку, а таксама не прапускалі ніводнай футбольнай гульні на стадыёне "Дынама", бо жылі побач. Мы ведалі пра мінскае "Дынама" усё, а некаторых футбалістаў асабіста з таго залатога складу "Дынама" 1982 года. У нашым студэнцкім пакоі бывалі слынная футбалісты мінскага "Дынама". Памятаю неяк рана лёг спаць. Прыбягае Лёнька і будзіць: "Прачынайся, да нас госць прыйшоў — Віктар Шышкін". Сапраўды, Лёнька з хлопцамі прывёў вядомага футбаліста, які для нас наладзіў цэлую прэсканферэнцыю.

З Лёнькам мы хадзілі на літаб'яднанне "Узлёт", якім кіраваў прафесар Алег Лойка. Нас нават запрасілі на VIII з'езд пісьменнікаў, дзе мы ўпершыню ўбачылі амаль усіх беларускіх пісьменнікаў, а таксама Ларысу Геніюш, якая сядзела ў зале з Нінай Мацяш і Уладзімірам Караткевічам.

Неяк Лёнька даведаўся ад старшакурснікаў, што выкладчык беларускай мовы Лявон Іванавіч Бурак пасля некалькіх лекцый дае дыктоўку. Тэкст дыктоўкі выкладчык ведае на памяць. Гэта пачатак аповесці Якуба Коласа "Дрыгва". Тэкст пачынаўся так: "Па-над Прыпяццю між лясоў, пяскоў і балот туліцца невялікая вёсачка, хат можа так трыццаць ці сорак...". Лёнька кажа: "Пойдзем у бібліятэку, возьмем "Дрыгву", сядзем за парты, пакладзем кнігі на калені і будзем пісаць дыктоўку". Мы так і зрабілі: увесь тэкст спісалі з кніг. А ў канцы дыктоўкі Лёнька кажа: "Можа зробім па пару памылак, а то здагадаецца выкладчык, што спісалі...". Хлопцы пару памылак "зрабілі", а я не рабіў, я напісаў так, як было ў Коласа. Праз некалькі дзён Лявон Іванавіч Бурак прыходзіць на лекцыю, а я пытаюся ў яго: "Лявон Іванавіч, а як мы там напісалі дыктоўку?". "Дрэнна, Чыгрын, дрэнна!", — адказаў выкладчык. "Чаму дрэнна?", — пытаюся ў яго, але так хацелася крыкнуць, што мы ўсё спісалі так, як ёсць у Коласа. Але ён не адказаў, якія мы атрымалі адзнакі. Лявон Іванавіч толькі выклікаў мяне да дошкі, дзе я дзве гадзіны даказваў, чаму і дзе я паставіў гэтыя знакі прыпынку, а не іншыя. Лёнька доўга рагатаў, маўляў, трэба было ўсё ж "зрабіць" пару памылак.

Леанід Трубач шмат чытаў. Але найбольш ён захапляўся паэзіяй свайго земляка Уладзіміра

Дубоўкі. Пра Дубоўку ён мог распавядаць суткамі. Ужо тады ў 1980-я гады ён расказваў нам пра тое, што паэт 27 гадоў прасядзеў у сталінскіх лагерах, а пасля рэабілітацыі яму не дазволілі жыць у Беларусі і ён стала асеў у Маскве. Ды і дыпломная праца ў Леаніда Трубача была прысвечаная творчасці Уладзіміра Дубоўкі. А кіраўніком гэтай працы быў Ніл Гілевіч.

У студэнцкія гады Лёнька Трубач, як і ўсе мы, хлопцы з правінцыі, жыў у Мінску сціпла. Калі што прывозілі з дому — частаваліся разам. Калі Лёнька даставаў з сумкі матуліны пачастункі, то казаў: “Частуйцеся, гэта з радзімы Уладзіміра Дубоўкі!”. Радзіму сваю, Пастаўшчыну, ён дужа любіў.

Нарадзіўся Леанід Трубач 25 красавіка 1963 года ў вёсцы Гута Пастаўскага раёна. Скончыў Пастаўскую сярэднюю школу № 1 і філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Пасля заканчэння універсітэта малады, узнёслы, поўны мар і творчых ідэй, вярнуўся ён на родную Пастаўшчыну. Спачатку працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Цёплаўскай васьмігадовай школе, а потым — выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў СШ № 1 г. Паставы. У той самай школе, дзе вучыўся сам.

У гэтай школе працавала з ім і жонка Святлана, тут вучылася дачка Таццяна, якая пайшла па слядах бацькі і займаецца цяпер на пятым курсе філфака БДУ. Усё ў ягоным жыцці, здавалася, складвалася някепска. Тым не менш Леаніду Трубачу рэдка выпадалі дарункі лёсу. Рана не стала ў яго бацькі. Потым памёр айчым, а затым гэты свет пакінула і маці. За маці ён вельмі перажываў, думаў, трывожыўся. А яшчэ яго хваляў лёс роднай мовы, лёс краіны. За ўсё Лёня хварэў душой і сэрцам.

Вершы Леанід Трубач пісаў рэдка, больш пераапрацоўваў ранейшыя, перапісваў радкі, страфы. Жонка Святлана і дачка Таццяна раілі яму сабраць усе творы пад адну вокладку і выдаць асобным зборнічкам. Ён катэгарычна адмаўляўся і казаў, што сёння не да вершаў, ды і час на іх не прыйшоў. У апошнія гады Лёня пісаў сцэнарыі школьных мерапрыемстваў. Яму гэта больш падабалася, ён бачыў на школьнай сцэне, як сцэнарыст і рэжысёр, вынікі сваёй працы...

Летам 2010 года мы, аднакурснікі Леаніда Трубача, збярэмся на свой юбілей — 25-годдзе з дня заканчэння універсітэта. Сярод нас не будзе толькі Лёнькі Трубача. Светлага, інтэлігентнага, шчырага, таленавітага аднакурсніка. Ён нарадзіўся вясной і вясной 2009 года яго не стала. Ён яшчэ не паспеў пасеяць зерне сваёй паэзіі, яго літаратурная сяўба яшчэ не пачалася. Лёня збіраўся сеяць зерне вясной, якую чакаў, чакаў *сваю* вясну:

Ціша. Спакой. Не было быццам бруду,

Зерне збіраюся сеяць вясной…
Я не спяшаюся — некалі буду,
Сёння, жыццё, застаюся з табой.

Але жыццё яго рана скончылася, а нам, аднакурснікам, і родным людзям, а таксама ўсім беларусам, ён пакінуў вершы, якія склалі гэтую кнігу.

Сяргей ЧЫГРЫН

## ВЕРШЫ

***

Узбоч дарогі — толькі камяні,
Завея ім бінтуе рупна шчокі.
Гнядога добрым словам падгані —
І ззаду застануцца ўсе папрокі.
А горыч страты гэтак не растане,
Як белы пыл з-пад лёгкіх капытоў.
Штурхае памяць думкі на паўстанне
Супраць прыгнёту сцішаных гадоў.
Над вёскай часта плача снегам неба,
Зіме дубровы медзь — не распрануць.
Які ж агонь, душа, табе патрэбны,
Каб сэрцу праўду вечную вярнуць?

***

Закружыліся думкі завейныя,
Далячынь паміж намі ляжыць,
А масты не заўсёды надзейныя,
І так хочацца болей пражыць.
Каб сустрэцца пасля развітання
І пазбыцца пакутнай нуды.
Паглядзець на таемнасць світання,
Паспытаць каб крынічнай вады.
Слоўцы чыстыя слухаць дзіцяці,
Дакрануцца да мілых мне рук.
Стане ціха, спакойна у хаце,
Самы ціхі пачуецца гук.
Закружыліся думкі завейныя,

Далячынь паміж намі ляжыць.
Вы не дзьміце, вятры сухавейныя,
Час і так вельмі хутка бяжыць!

**Санет**

Крыжы плывуць над Мядзелкай-ракой,
Званы гавораць зноўку аб вячыстым.
І на душы спакойна, светла, чыста,
Слухмяны конь не ўздрыгне пад рукой,
І доўжыцца вячэрні вадапой.
У засені ля клёнаў залацістых.
Звініць аброць. Я чую голас чыйсці.
Мо вершнік з той мінуўшчыны сівой?
З мячом і дзідай колькі перамог
Ты зведаў. Колькі ты прайшоў дарог,
Калі Айчыну нішчылі чужынцы!
Пакуль не ўпаў і не заплюшчыў вочы.
… Ляжаць стагоддзі, як лістота на дзядзінцы.
І не згасаюць свечкі-зоркі ўночы.

***

Гавары па-беларуску, чалавек,
Не хавай у прыцемках
душы цудоўнай,
У цябе ж такі кароткі век,
Хто ж крынічаньку вадоў
за нас напоўніць?
Гавары па-беларуску, чалавек,
Падтрымай агеньчык кволы
напрадвесні,
Не давай чыніць
над роднай маці здзек,
Дай магчымасць
для палёту роднай песні.
Гавары па-беларуску, чалавек,
Цёмным днём і сярод зімнае завеі,
У цябе ж такі кароткі век
І даўжэзныя дарогі да надзеі…

***

Разыходзяцца лёсы, а межы
Рвуць зацятую повязь гадоў.
Ды стаяць старажытныя вежы:
Колькі лягло ўжо пад імі галоў!
Быў пад поўдняю белай чырвоны
Ад крыві заваёўнікаў плюшч,
І лунаслі чужынцам праклёны…
Не забудзься, вачэй не заплюшч.
Не забудзься, як мову тапталі —
Роднай маці балючай ці будзе.
Не адзін яшчэ ў прыцемках блудзіць.
Як жывеш між віхураў, старонка?
З кім выходзіш ў нязведаны шлях?
Арабіны чырвоная гронка
Як паходня, гарыць у снягах.
Першы крок паміж песняй і болем
Зробіць разам адвечны хаўрус.
Хай разносяць вятры па-над полем
Кліч Купалы: “Жыве Беларусь!”.

**Настаўніцы роднай мовы**

Ляжаць азёры, быццам таямніцы,
Ліецца песня — рэха да вышынь,
Вандруе човен твой між лозаў ніцых,
Паміж узгоркаў мілых і вяршынь.
Плывуць гады, як лісцейка увосень,
Ад той крыніцы з роднага сяла,
Зноў верасень на вальс цябе запросіць,
Да жаўрукоў каб радасць павяла.
Над словам нашым пашчыруем разам
І будзем слухаць вучняў галасы,
Паўторымся і неаднойчы скажам:
“Няхай растуць з зярнятак каласы!”.

***

*Уладзіміру Дубоўку*

Туман схаваў цнатлівасць мокрых дрэў,
Не дачакаўшыся спаткання.
Лістом апошнім вечар дагарэў
І змоўк на слове развітальным.
Ад вогнішча салодка-горкі дым
Трывожыць вочы, твар хавае.
Прыпынімся з табою, памаўчым:
Хвіліна урачыстая якая!

**Трыялеты**

1

Калі матулін боль у сэрца мне пастукаў,
Я на яе сівую скронь глядзеў.
Дзяцінства свет назад вярнуць хацеў,
Калі матулін боль у сэрца мне пастукаў.
Між зорак сеялася рэха ціхіх гукаў,
Бусліны клёкат ад выснoў ляцеў.
Калі матулін боль у сэрца мне пастукаў,
Я на яе сівую скронь глядзеў.

2

Тваіх вачэй блакіт нязнаны
Мне і дагэтуль дарагі.
Зноў два злучае берагі
Тваіх вачэй блакіт нязнаны.
І не баляць цяжкія раны,
Не вабяць здрады мурагі —
Тваіх вачэй блакіт нязнаны
Мне і дагэтуль дарагі.

3

Аціхне боль пад белай поўняй,
І золак чырванню адорыць.
З нашчадкам продак загаворыць —
Аціхне боль пад белай поўняй.
Шлях да сябе такі няроўны —
Смяецца шчасце, цісне гора…
Аціхне боль пад белай поўняй,
І золак чырванню адорыць.

**Хата**

Прымерзла да зямлі падмуркам хата,
Ёй снег — як паратунак ад гадоў.

На шчасце й радасць не была багатай,
Збіраючы да столу сваякоў.
Аслепнуўшы ад зыркага агню —
Тады гарэла нават голле клёнаў —
Для вёскі захавала цішыню,
Хоць безліч чула плачу і праклёнаў.
А зараз зносяць. Гыркае бульдозер,
Лязо нажа ступіўшы аб каменне.
І дзед Іван, укленчыўшы на возе,
Закурвае: “Знікае пакаленне...”.

**Акравершы**

1
Сярпасты месяц зноўку жне
Высокі колас спелых зорак.
Якой дарогай крочыш? Дзе
Тваіх вачэй блакітны золак?
Ласкавы дотык лёгкіх рук
Абудзіць радасць пры сустрэчы,
Нібы накцюрна першы гук...
А мы ўдваіх. Спыніся, вечар!

2
Гайдае восень лісце клёнаў,
Ад рання дзень усмешкі просіць...
Ляціць дарога незнаёма,
І успаміны вецер носіць.
Нас Мінск калісьці пазнаёміў,
А Віцебск зараз звёў нанова...

3
Святло душы тваёй заўсёды шчодра свеціць,
Вясновы вецер быццам між снягоў.
Ярчэй палаюць праз гады суквецці
Таго, што звацць Надзея, Вера і Любоў.
Ляціш удалеч птушкай лёгкакрылай
Ад роспачы пакутлівых дарог,
Надзейнай будзь, пяшчотнай, добрай, мілай,
Ад сцюжаў злых каб Бог цябе збярог.

4
Тваё жыццё — як росны ранак,
Ад промняў сонца да расы.
На свет глядзіш загаравана,
Як на валошкі каласы.

**Вясковая хата**

Да яе і даехаць нялёгка,
Хоць даўно прычакала яна...
Гаспадар не ўздыхне ўжо з палёгкай —
Ён жыццё ужо выпіў да дна.
Смех дзіцячы блукае па свеце,
Заблудзіўшыся ў тлуме сталіц.
Разгубіўся і восеньскі вецер
Сярод болю пустых аканіц.
З цішынёй размаўляюць бярозы,
Як даўней адвячоркам сусед.
І дажджынкі — халодныя слёзы —
Навылёт прабіваюць Сусвет...
Толькі памяць пакінулі людзі —

Ад яе нам нікуды не дзецца.
Сярод ночы яна нас разбудзіць:
Гэта ж там наша вечнае сэрца!

**Дзверы**
Дзеля прыліку стукнуў ціха
У прыгажосць дзвярэй, не бачаных ніколі,
І нечакана перастаў я нават дыхаць,
Як адчыніў іх цікаўна і паволі.
Нічога і нікога, акрамя пустэчы
І нешматслоўя рэдкіх гукаў.
Такой халоднай не ўяўляў сустрэчы,
Калі надзеі пад красою гушкаў.
Як расхіне душу тваю выпадак,
Пільней угледзься, абмінуўшы дзверы.
Што там? Пустой нікчэмнасці асадак,
Ці хараство, якому можна верыць?..

***
Здаецца, дзень пражыты недарэмна:
Спакойна на душы, ў вачах — святло.
Але ж маўчала сэрца, гэта дрэнна,
І госцем не прыйшоў ніхто ў жытло.
Пад небам зорным — россыпы жаданняў,
Снягі схавалі шчодрую раллю.
Сустрэч імгненні, безліч развітанняў:
Слязы не ўбачу ці не так ступлю…
Мароз трашчыць — размова з цішынёю,
Пад месяцам іскрыцца далячынь,
Вядуць гаворку думкі між сабою,
Увагі не звяртаючы на стынь.
Здаецца, дзень пражыты недарэмна:
Спакойна на душы, ў вачах — цяпло,
І не аднясць таго, што неад'емна,
І не злавіць таго, што уцякло.

**Снег**
Сеецца, сеецца снег урачысты,
Першы, чаканы на чорнай зямлі…
Верым у лепшае, шлях наш вячысты,
Шмат што зрабілі, а што — не змаглі.
Сівер насунецца, мабыць, суровы,
Спыніць цячэнне няспешнай ракі.
Можа, адтаюць, сагрэюцца словы
З поціскам цёплай сяброўскай рукі.
Кружаць праблемы, вярэдзяцца раны,
І апускаецца снежаньскі змрок.
Нехта ж шчаслівы ідзе, закаханы,
Нават не чуцен па сцежцы той крок…
Сеецца, сеяцца снег урачысты,
Першы, чаканы на чорнай зямлі,
Сонечны позірк быў надта іскрысты:
Той адлюстровак мы не зберaглі…

**Дзеясловы**
Прайсці, заўважыць, азірнуцца,
Захваляваца, усміхнуцца.
Спыніць, дамовіцца, пачуць,
Крануць, пацалаваць, адчуць.
Заплакаць, страціць, забаяцца,

Не зразумець і не вяртацца.
Кахаць, пакутаваць, шукаць,
Знайсці, паверыць, даравадь…

**Арэлі**
Разгуляўся на досвітку вецер,
Закружыў карагоды лістоў.
Існуём мы у стомленым свеце
Ад мінулых пакутных часоў.
Светлы хорам злажыць не паспелі,
Разваліўся падмурак пад ім.
Захісталіся страшна арэлі
На якіх мы, знямеўшы, сядзім.
Адарвёмся вось-вось ад зямлі мы,
Што там будзе, куды паляцім?
… Студзіць кроў нечаканы зазімак,
Даўніх мараў развеяўся дым.

***

*Памяці А.К.Раманоўскага*

Бяда гукнулася па хатах,
Пагасла ўсмешка ад вятроў.
Чакала поле рук шурпатых,
А ты знямогся, не прыйшоў.
Нас лёс не песціць аніколі,
Хто мог бы жыць — ён не жыве.
І цяжка верыць, што ўжо болей
Не прыйдзе ранак да цябе.
Душа балесна скаланецца
Ад слёзаў скрушнае ўдавы.
І сэрца зноў не адгукнецца
На шчэбет роднае дзятвы.
Асенні ліст зляцеў да долу —
Агеньчык свечкі на быльнёг.
А як цябе чакаюць дома,
Бы на хвілінку ты прылёг!...

***

Касмічныя вышыні невычэрпнага кахання
Хвалююць прадчуваннямі, сузор’ямі сустрэч,
І Млечны шлях пад намі — як дарога да спаткання,
Калі бяжыш, спяшаешся ад дзён абрыдлых прэч.
Шукаю між багацця лёсаў чалавечых
Крышталь крынічны прыгажэйшых ў свеце росаў-зор,
І непакоюся: як мала засталося ісцін вечных,
Як многа паміж намі стала межаў і разор…

**Мне — семнаццаць!**
Вось і ўсё. Адцвіло і дзяцінства, як май,
Адыходжу ад родных парогаў…
Успаміны плывуць — паспрабуй затрымай,
Калі кліча ад дому дарога.
Маці моўчкі услед мне глядзіць з-пад рукі,
Заблішчэла слязінка на твары.
Вышынёю і песняй жывуць жаўрукі,
Аб высокім — надзеі і мары.
Мне — семнаццаць, мне хочацца верыць і жыць
І яшчэ не было мне балюча…
Мне — семнаццаць! А час, як падлетак, бяжыць
Да юнацтва вытокаў гаючых.

***

У жыцці сустракаюцца ўсе:
Семафор з цягнiком на паўстанку,
І дажджынкі шумяць на страсе,
Нібы дзецям пяюць калыханку.
Закаханыя сэрцы — іх два —
Зачаруюць душу аж да рання.
І сцяжынка бяжыць на спатканне —
Бальшаку паказаць юны твар.
Поруч з Памяццю ўдзячна стаім
І матуліны рукі ўслаўляем.
А сустрэчы з сумленнем сваім —
Ці заўсёды іх смела чакаем?

***

Я памыляўся цяжка неаднойчы —
Як жа душа тады ад роспачы баліць...
Найясны дзень здаецца прорвай ночы,
Пытанні мрояцца-віхурацъ: як жа быць?
Твае цалую цёплыя далоні
І вочы дарагія ў дыяментах слёз...
Табе я усміхнуцца не дазволіў —
І радасць нашу вецер некуды панёс.
Няхай я твой не лепшы падарунак —
Ты вінаватай не сячы мне галавы...
Успомні мой юнацкі пацалунак,
Калі нясмела называў цябе на “Вы”.

***

Секунда, мінута, гадзіна, дзень —
Ляцім мы па вашых спрадвечных хвалях.
За радасцю, шчасцем — расстання цень
Не шкадуе вачэй закаханых.
Секунда, мінута, гадзіна, дзень,
І сны, нібы замяць лісця ў адчаі.
Пытанняў сувоі: калі і дзе
Я вясновую квецень спаткаю?..
Секунда, мінута... Нястрымны час
Абрэзаў надзеі крыло дазвання.
Усё ж такі веру: аднойчы й нас
Адшукае світанак кахання!

**Слёзы**

Я сустрэў у блакіце вачэй дарагіх
Адлюстровак сваіх спадзяванняў, трывог.
Я знайшоў твае рукі, каб потым без іх
Не выходзіць у далеч вялікіх дарог.
Я адчуў тваіх вуснаў палаючы жар,
Ён дашчэнту спаліў адзіноту маю.
Я прыняў на сябе твайго болю цяжар,
Тыя раны каханнем адным загаю.
Голас сэрца твайго я пачуў уначы,
Колькі знічак упала тады на мурог!
Мы былі, нібы птушкі ў Зямлі на плячы...
Як жа слёзы твае я убачыць не змог?

**Сустрэча**

Не наталюся сустрэчай адзінай:
У блакіце вачэй — невычэрпнасць крыніцы.
Маці дарэмна гукае дзяўчыну:

Вусны да вуснаў — ну як не спазніцца!
Рукі ўзляцелі...
І голас дрыжыць...
Толькі бусліныя крылы над ліпай...
Як жа хацелі кахаць мы і жыць!
Звон той крынічны час ужо выпіў.

***
Як жывеш ты, мая летуценніца,
Каму дорыш ты думкі свае?
Квецень лета не прыйдзе, не вернецца,
Аблачынкаю боль растае.
Над дарогаю пыл спадзявання
Больш не ўзнімуць адчайна вятры.
Я забыўся на радасць спаткання,
Як калісьці забылася ты.

***
Знерухомела ноч і прыспала лугі,
Рака разбухмаціла ніцыя лозы.
З небакраем зліліся лясоў берагі,
І сена расее да раніцы ў возе.
Прастуджаны драч адгукнуўся нясмела —
Зоркі навобмацак рэха пакраталі.
Збажына, уздымаючы колас няспелы,
Яснее, глядзіце, за цёмнымі хатамі.
Вятрыска шумне, расштурхае асіны,
Ажно здрыгануцца спрасоння камлі...
Радзіма! Твой колас я не адзіны
І не апошні на гэтай зямлі.

***
Усё. Зарніцай адмільгалі дні,
І восень лісце пазрывала з дрэў.
І больш цябе я ўжо не сніў,
Мяне твой погляд больш не грэў.
Я цёплы ветрык здаля сустракаю:
Мо ад цябе ён вестку прынясе?..
А ноччу шчырай, па-над ціхім гаем
Губляе неба зоркі пакрысе.

***
Сонца. Зіма і заўсёдныя святы,
Мноства надзей, спадзяванняў, трывог.
Дождж недарэчны ідзе, зухаваты,
Як напамін пра умоўнасць дарог.
Людзі. Вада, некалядныя строі,
Веры ў прыкметы народныя менш.
Ісцінаў вечных не можам засвоіць,
Хоць перад крыжам анёлам укленч.
Сэрца. Пытанні, балючыя змены,
Толькі чаму, за які такі грэх?
Ты ж не бярэш ад жыцця поўнай жменяй,
Не прадаваў ты і леташні снег?
Ціша. Спакой. Не было быццам бруду,
Зерне збіраюся сеяць вясной...
Я не спяшаюся — некалі буду,
Сёння, жыццё, застаюся з табой.

***

Падары мне надзею такую,
Жаўруковай што песняй звініць,
Я цябе, як тады, пацалую,
Хай крынічка смяецца-бяжыць.
Хай аблокі глядзяць са здзіўленнем
На дваіх закаханых палёт,
І квітнее душа зіхаценнем,
Хоць няўзнак пралятае дзень-год.
Пазайздросціў і месяц — наш сведка,
Нешта зоркам сваё прашаптаў,
Бо такое здараецца рэдка:
Цеплыня сярод зроснелых траў.
У тваіх валасах павуцінка —
Спадарожніца доўгіх гадоў,
Для мяне ты і зараз дзяўчынка —
Я шчаслівы, цябе што знайшоў.

**Зімой**

Першы снег ацярушыць ваколле,
Завіхурац вятры над ракой,
Не спаткацца ніколі нам болей,
За руку не узяцца рукой.
Маразы нашы выстудзяць душы,
Забяруць і надзею ў палон,
Я застацца цябе не прымушу,
Як не пойдзеш і ты на паклон.
Адшчыміць, адпакутуе сэрца,
Але будзе адлігу чакаць,
Каб не даць тым пачуццям памерці,
Каб хоць нешта, але захаваць...

**Першая школа ў Паставах**

Хаваецца ў прысадах наша школа,
Бы лебедзь белы сярод хваль зялёных,
Штогод малых прымае навасёлаў,
Крыху спалоханых і незнаёмых.
Звініць званок ад рання галасісты,
Гуляе сонца ў вокнах, як падлетак,
Ідуць урокі — момант урачысты —
А вуліца жыве чаканнем дзетак.
На Юбілейнай — весела і шумна,
Тут маладосць віруе да змяркання,
Няхай жывем мы часам легкадумна,
Але ж да школы крочым на спатканне.
Бягуць у класы ўнукі першых вучняў,
Жартуюць :"Вось дзе дзед сустрэў мой бабку!"
Гісторыя не любіць словаў гучных,
І многае ў жыцці для нас — загадка.
Аснежыў час настаўніцкія скроні,
Былі тут радасці, былі няўдачы...
Успомніцца, як падстаўляў далоні
Пад дожджык-россып талентаў дзіцячых.
Стагоддзе дваццаць першае сустрэла
З заўсёднай цеплынёй у добрым сэрцы,
Хачу, каб зорка школьная гарэла,
Душы маёй каб не дала памерці.

**На могілках**

Нясмелы снег — бялюткі сум,

Лісток апошні — быццам свечка.
Не чуцен тут штодзённы тлум,
Бо пад крыжамі — наша вечнасць.
Стаіць на месцы, плача час,
Сасна да неба цягне рукі,
І цішыня пільнуе нас,
Крылом сваім хавае гукі.
Плыве малітва да святынь
І зноў вяртаецца у сэрца…
Гары, агеньчык, не астынь,
І не давай душы памерці!

**Матуліны вочы**
Мінаюць бяссонныя цёмныя ночы,
І ранак над хатаю песняю звоніць.
У памяці нашае — матчыны вочы,
Адзінае, час што дазволіць успомніць.
Вясёлыя, сумныя, колерам розныя,
Ў іх роспач, надзея і слёзы ад болю,
Дзень летні і восеньскі, слота марозная,
І ўсё ж такі кветак вясновых ў іх болей.
Ну, як не любіць іх, калі вырастаеш,
І як не заўважыць, як крочаць гады?
Калі толькі маці ці бацькам ты станеш,
Усю глыбіню іх адчуеш тады.

**Дзве галавы**
Зноў лямант, вэрхал па абшарах
Ляціць, як страшная залева:
“Даеш двухмоўе, ў ім — парадак,
І што нам новыя павевы!”.
Адпаў мароз, слата пануе,
У душах — бездараж, адчай.
Хто ж, беларус, цябе пачуе,
Калі вядуць народ у рай?
І звыклы нонсенс — дождж калядны —
Ужо не здзівіць і старога.
І сніцца сыну сон прынадны:
Да маці знікшая дарога.
Ідзе зіма, нямеюць гоні,
Кладзецца снег на раны мовы…
І як прывід — замест Пагоні
Арла са скіпетрам галовы.

**Пачатак 90-х**
Молімся ідалам грэшным з імпэтам,
Д’яблу прадаўшы пакутныя душы.
Думаем, што завалодалі светам,
Прага да ўлады знясільвае, душыць.
Храмы у сэрцах аддалі пад стайні
Чорнае злосці, ліслівай маны.
Нас абкружылі ваўчыныя гайні,
Думкі — не думкі, адны лахманы.
Босыя крочым па снезе пякучым,
Памяць пакінуўшы служкам Іуды.
Сонечны бляск нам ужо надакучыў,
Цемрай жывём, нібы здані-прыблуды.
Веру згубілі — не верац і нам,
Кніга Чырвоная — сотні тамоў…
Круцімся з ніткаю верацяна

І не знаходзім дарогу дамоў.

***

Адышоў чалавек — прамільгнула і зорка,
Што гарэла у небе заўсёды высока.
Даўні бэзавы цвет пахне скрушна і горка,
Нехта кветкі матулі падорыць далёка…
Свежы жнівеньскі вецер хвалюе радзіму,
Між калоссяў цяжкіх шлях дадому шукае.
Ён расінку на дрэве адну не пакіне,
А з дажджом прашуміць па-над мядзельскім гаем.
І пакуль тут крынічная песня ліецца,
Маладзеюць душою сівыя Паставы.
І праз сотню гадоў слова ў нас адгукнецца…
Проста так, не для гучнай і зманлівай славы.

**Крокі**

Памяці Мішы Мароза, які загінуў,
выносячы з бульбянога поля
снарад Другой сусветнай вайны

Крок. Першы, другі…
дзевяты…
Крок ад людзей і да людзей
крок.
Здрыгануліся сэрцы былых
салдатаў.
Крык пад неба: “Сыночак!
Сынок…”.
Крочы асфальтам і ранішняй
сцежкай,
На мастах невядомасці я не стаю.
Адгукнецца ўспамін журботнай
усмешкай,
Словы выбухнуць, як жа я іх
стаю?
Крокаў, крокаў розных —
тысячы!..
Каб не вінавацiла сумленне
болей,
Ці змог бы я гэтаксама
высечы
Крок звычайны
на незвычайным полі?

***

Кляновы ліст ляціць адзін да долу,
Бязгучнасцю кранае мне далонь.
Адолець шлях я напалову здолеў,
А першы іней лёг ужо на скронь.
Наперадзе — шляхі, расстанні, стрэчы,
Балеснасць страт і пошукі сябе.
Я не хачу, каб набліжаўся вечар,
Як не магу і жыць я без цябе.
Збівае снег апошняе убранне
З самотных постацяў знямелых дрэў,
Але жыве, гарыць маё каханне,
Якое выпадкова я сустрэў.
Не вечны снег, як і мая дарога,
Але іду, спяшаюся далей.
Лісток жа восеньскі —

мая трывога —
Знікае пад нагамі у людзей.

***

Бярозкам холадна увосень,
Калі імжыцца дзень за днём.
Яны ўжо неба і не просяць,
Бо так было, было здавён.
Гаёчак белы — і чарноцце
Палёў абложных і раллі.
Агеньчык кволы й цемра ночы,
Як сімвал роднае зямлі.
Бярозкам холадна увосень,
Але звіняць лістом дубы,
Як напамін аб леце босым,
Нібы замова ад бяды.

***

Жанчына ціха плакала ўначы
Пад спеў вятрыскі, шум лістоты.
Рука аціхла на чужым плячы,
Няма ў вачах былой пяшчоты.
Удвух — і ўсё ж бязлітасна адна,
Забытай зоркай неба свеціць,
Згубіўся сон, далёка да відна.
І толькі восень ва ўсім свеце.
Маны вуголле, роспачы агмень,
У холад шкла рабіна б'ецца.
Душу спаліў пякельны той сухмень,
Што зараз трызніцца здаецца.
Жанчына ціха плакала ўначы,
А свет не чуў — аглух ад болю.
Ну як жа ёй каханне зберагчы,
Калі ніводнай кветкі ў полі?..

***

Як сумуе жанчына, не трэба
Варушыць патаемныя думкі яе.
Не хвалюйце вячэрняе неба,
Як яно позняй птушкай камусці пяе.
Бо жанчына — прадонне Сусвету,
Акіянаў глыбіні, пустыняў сухмень.
Зразумейце загадкавасць гэту,
Падтрымайце дрыготкі і кволы прамень.
Быццам першая весняя кветка,
За табою яна і цябе павядзе.
Будзе ветах, як здзіўлены сведка,
З-пад аблокаў начных на сустрэчу глядзець.

***

Нам засціць вочы пыл стагоддзяў:
Чужых прымаем за сваіх.
Не бачым вёснаў і разводдзяў,
Нібыта ўвесь Сусвет аціх.
Як той трыпутнік пры дарозе,
Мой край знявечаны ляжыць.
Крумкач пячэцца аб народзе:
Ну, колькі ты шчэ будзеш жыць?
І рэкі поўняцца тугою —

З іх смагу нам не наталіць.
Гаворым мовай мы другою,
Хоць ёсць душа, ды — не баліць.
У роднай хаце — быццам госці —
На лавы селі і глядзім.
Чужынец-кухар кіне косці,
А мы, удзячныя, з’ядзім.

**Дождж**
Дождж няўдзячны блукае па твары,
Добра плакаць такою парой:
Слёз не ўбачаць ні людзі, ні хмары,
Толькі памяць ірве градабой.
Не шукай да сустрэчы дарогу:
Наш вятрыска ужо адляцеў.
І пакінь назаўсёды трывогу:
Жаўрука не пачуем мы спеў.
Я не помню азёрныя вочы,
Маразоў не чакаю ад зім,
Толькі сэрца адчайна грукоча:
Ты адзін, ты адзін, ты адзін.

**У дарозе**
Пад перастук вагонных колаў
Імчацца думкі ў пашчу ночы.
Агеньчык — парастачак кволы —
Мільгнуў і ў цемры знік, як збочыў.
Злуе жалеза, свішча блудны вецер,
І спакваля знікаюць кіламетры…
Я без цябе — адзін ва ўсім Сусвеце,
Вакол — чужых мясцінаў нетры…

***
Асаблівасць вясновага ззяння,
Па-над рэкамі — чаіцаў крылы.
І далёка яшчэ да змяркання,
І не ўсе яшчэ зоркі адкрылі.
Угары — крышталёвае ззянне,
Па-над хваляю — чаіцы крылы.
Мы маўчым на вясновым спатканні,
Нашы сэрцы ўсе тайны адкрылі.
Пахне водарам лотаці першай,
Вецер песціцца ў лозах надрэчных.
І ў душы нараджаюцца вершы,
Сонца нас запрашае у вечнасць.
У вачах — той блакіт адмысловы,
Што не зблытаць ні з кім мне на свеце…
І ліюцца крынічныя словы:
Можа, ўспомнім калі аб паэце?..

***
Вясёлы час, трывожны час
Ад нараджэння ўсіх люляе.
Ля роднай хаты маці нас,
Як птушак, з выраю чакае.
Няма цяпла, зіма ідзе,
Цяжэй знаходзіцца дарога…
І памяць светлая ўпадзе
На снег бялюткі ля парога.
Ад нас жыццё не просіць многа…

***

Чужой бяды ніколі не бывае,
Яна не ходзіць госцяй між людзей.
Як жонка ці сястра за стол сядае,
Глядзіць на нас, як нейкі дабрадзей.
А мы маўчым, баімся і нямеем,
Бядзе кавалак лепшы аддаем,
І вось у трыццаць стомлена сівеем,
Гадоў шчаслівых вечна не стае.
Яна на балі крочыць гаспадыняй,
Сваіх падданых вырашае лёс:
Каго зняважыць, а каго абдыме,
Каго схавае ў моры горкіх слёз...
Чужой бяды ніколі не бывае...

***

Непадобная ты на змяркання часіну,
Параўнаць не магу цябе з ветрыкам я.
Усміхнулася мне па-над хваляю сіняй,
Запляла ў валасы песню-спеў салаўя.

Хвалявала туман чараўніцай начною,
Пацалункам кружыла хлапцову душу.
І было нам далёка да зімніх сувояў,
Калі разам прасілі аб шчасці Ушу.

Над ракою сплывалі юначыя мары,
Месяц зорны дыван угары разаслаў.
І слязінка трывожыла дзеўчыны тварык:
Ну, чаму я далёка ад мілых Пастаў?

Непадобная ты на змяркання часіну,
Параўнаць не магу цябе з ветрыкам я.
Я цябе ў адзіноце і зараз не кіну,
Толькі слухаць і слухаць таго салаўя!

**У Карэліі**
Ой, рэчка Кепа, не спрачайся
З аслізлым каменем парогаў!
Рыбпцкі вечар, пасцяшайся,
Тайга — няблізкая дарога.
Агонь атуліць цеплынёю,
Святлом юначага прызнання,
І рукі — крыллем над табою
У вечаровым нашым ранні.
...Шугалі іскры пад нябёсы
І там, халодныя, знікалі.
А словы біліся аб плёсы,
Як чаек крыкі па-над хваляй.

**На Белым моры**
На шэрыя скалы грабеньчыкі хваляў
Халоднае мора шпурляла пад вечар.
А чаіца ўверсе — як безліч караляў,
Як тлум старажытны забытага веча.
Смяялася сонца з настрою майго:
“Сядзі, закаханы, а я — на спачынак,
Трывожнае ночы не дай табе Бог
У дзіўным чаканні паморскай дзяўчыны”.

Зірнуў — і яно прысаромлена знікла,
Нібыта згарэўшы ад чырвані дзёрзкай.
А я развітаўся з бярозкаю звыкла,
Такою амаль, як за роднаю вёскай.

**Ламбушка**[1]

Параслі асакой тыя хвалі,
Што ішлі на тайгу грамадой,
Белакрылыя чайкі схавалі
Светлы сум па-над ціхай вадой.
Ад людзей — толькі стрэмкі бярвенняў
У скалістых грудзях берагоў.
Без рыбацкіх надзей летуценняў
Апусціліся плечы чаўноў...
На зыходзе вячыстага круга
Захлынулася сумам сасна.
“Не губляйце адзінага друга! —
Быццам просіць планету яна.

**На вывазцы лесу**

Пілаванне і трэскі пад ногі
Бела-жоўтым струменяць руччом,
І як знак нечаканай трывогі —
Крык птушыны над чорным карчом.
Парадзелі лясы над Дзвіною,
І далёка ад вёскі відаць...
Ці нясеш ты спагаду з сабою,
Каб другому яе перадаць?

[1] Так карэлы называюць невялічкія азерцы з топкімі берагамі.

У бліскучым блакітным Сусвеце
Мы шукаем прасцягі вясны...
Адгукаецца ж — восеньскі вецер
У скалечанай кроне сасны.

**Імгненні**

1

Апускалася сонца на плечы
Задуменных увечары дрэў.
Клён пахілы падумаў аб вечным,
Як апошнім лістом дагарэў...

2

Цішыню навакольных прастораў
Лось-вандроўнік знянацку абудзіць...
У прыроды не злічыш паўтораў,
Ну а ў нас?.. Колькі ў нас іх прыбудзе?

***

Барвовым полымем абпаліць боль
Раней не знойдзенага слова.
І глухне плач, як нявісае золь
Жыцця, пражытага не нова.
А ты вось змог. І чуў ты гэта слова,
Калі рабіў я толькі першы крок.
Ад вёскі я, і ты — мая выснова,
Агеньчык той, што асвятляе змрок.

***

Хацеў бы верыць у рамонкаў таямніцы…
У моц і веліч нашай дабрыні.
І слухаць гукі лозаў ніцых,
Маланкамі як неба загрымiць…

**Дзве вясны**
Вясна сорак першага года —
І святло бліскавіц па начах.
Вясна сорак першага года —
Трывогі цяжар на плячах.
Траншэі, бы вены пустыя,
Яшчэ не краналі палёў.
І дзеўчыны косы густыя
Снарадны разрыў не расплёў.
Буслы не гарэлі шчэ ў гнёздах
Над стрэхамі хат без людзей.
“Ці позна, ці позна, ці позна?!” —
Пытанне грымотных падзей…
Прыйшлі, і гулі, і балелі
Крывавыя водбліскі дзён.
Краіна ад гора сівела,
Але не ішла на паклон!..
Вясна сорак пятага года —
Берлінскія залпы вайны…
Спакой сорак пятага года
Пачаўся сяўбой збажыны.

**Успамін ветэрана**
Пясок і пыл. Грукочуць тракі,
Ірвуць з зямлёй маўклівую траву.
Нясцерпны боль адной атакі
Свінцом і беллю крые галаву.
Граната — як кавалак хлеба
На ўсю сям'ю у страшны недарод.
Праз зубы словы: “Гэтак — трэба!
Пакуль жыву — жыве і мой узвод!..”.
Быў не гранаты — сэрца выбух,
Які зацьміў магутнасць кілатон.
Палае танк. А ён — не выбег…
Дасюль над ім аблокі, як пантон.

**Галбяіца**
У імкненні вечным з кветкай парадніцца
Паказаў бульбоўнік вочы нечакана.
Сны мае люляе змалку Галбяіца,
Ды па вербах з ветрам мякка крочыць ранак.
Пагляджу: а шаблі промняў мые сонца,
З-пад вясельца пырскі — выпаўшыя росы.
Адкрыццё Радзімы — мройная бясконцасць…
За рачулкай чыстай — бацькавы пракосы.

**У самалёце**
Апошні стык бетоннай паласы
Назад рвануўся, выбегшы у поле.
Далёка ўнізе — жніўня каласы,
І толькі бездань неба над табою.
“Ляцім?!” — здзівіўся нехта праз хвіліну,
“А я нічога ўбачыць не паспеў,
Я поездам звычайна еду к сыну”, —
Тлумачыў дзед суседу нараспеў.

“Вы глянце, блізка ж сонечныя промні” —
Дзяліўся ён з усімі навіной...
Ды раптам страх пранёсся непадробны
Ў яго вачах, застыў перада мной...

***

Не чапайце апалае лісце,
Не кранайце ягоных вы сноў.
Ці было гэтак з вамі калісьці:
Хочаш жыць — паміраеш ізноў...

***

*Настаўнікам кафедры беларускай мовы і літаратуры СШ № 1 г. Паставы*

Нясуць беларускае слова у людзі
Шасцёра жанчын і адзін Леанід
Праз буры, што ёсць, праз хмары, што будуць,
Мацнеюць з гадамі, нібыта граніт.
Здаваць не прывыклі пазіцый без бою,
Ў атаку з акопа выходзяць заўжды.
Спраўляюцца з моўнаю спрытна бядою,
Ідуць непрыкметна праз час, праз гады.
Алена, Эльвіра, Тамара і Ніна
Шчыруюць на ніве Радзімы тваёй,
Галіна і Ліля, бы ў лузе каліна,
Падораць нам веды, вядуць за сабой.
Дык будзьце ж заўсёды са спрытам і жартам,
Збірайце вучнёўскіх у школе сяброў.
Хай радасць чакае за кожнай вас партай,
Натхнення на сотні яшчэ вам гадоў!

## 2. СЦЭНАРЫІ

**Мядзелка-рачушка**
Літаратурна-музычная кампазіцыя

Грэе сонейка ласкава,
Птушкі клічуць да нябёс,
Не уседзелі на лавах!
Калектыў як чорт панёс.
Наш географ маладзенькі
Назбіраў турыстаў колькі,
Жавароначкам заценькаў,
Як убачыў дзевак столькі.
Рукзакі надзеў на плечы,
Падцягнуў ім паясы.
Нежанаты сам, укленчыў
Пра уладаю красы:
“Вучыцелькі, гэй за мной,
У паход мы краязнаўчы
Пойдзем Мядзелкай-ракой,
Кінем вокам, быццам знаўцы,
Экалогію ацэнім,
Дзеткам прыклад пададзім,
Шлях адмераем суцэльны,
На парадак паглядзім”.
Колькі тварыкаў вясёлых!
Кій у рукі — і гайда!
Ад бальніцы да касцёла
Недалёчка, не бяда!

Гучыць песня “Ноч у Паставах”:
Медная цэгла касцёла
Цмяна блішчыць на вадзе,
Залатакрылым анёлам
Месяц па небе плыве.
Ціхія сосны Гарбаркі
Нешта гавораць скрозь сон,
Можа пра танцы і сваркі,
Можа пра швецкі палон.

Прыпеў: Горад мой, горад мой,
Горад над Мядзелкай-ракой.
Ціха жыве, лёгка плыве
У дваццаць першы век.

У возеры светлыя зоры
Срэбнай луской зіхацяць,
Побач груган вельмі чорны
Вылецеў іх паляваць.
Ноч набірае ўладу,
Робіцца цемра глыбей,
Зачараваныя хаты
Бліскаюць жоўцю вачэй.

Прыпеў: Горад мой, горад мой,
Горад над Мядзелкай-ракой.
Ціха жыве, лёгка плыве
У дваццаць першы век.

Вось Гарбарка прамільгнула,
Фестываляць тут Паставы.
Смеццем сосны не сагнула,
Камунгас зрабіў тут славу.
Прыбірае пасля скокаў
Шклянак горы, розны хлуд.
Рак-вусач і той завохкаў,
Як плылі бутэлькі тут.
Паўз гароды вузкай сцежкай
Прабіраемся, ідзём.
Дзень цудоўны, мы з усмешкай
Песні звонкія пяём.

Гучыць песня “Мядзелка-рачушка”:
Ой ты, Мядзелка-рачушка,
Прашапчы ты нам на вушка,
Дзе ты бегала-пятляла,
Дзе здароўечка губляла?
У Паставах на узгорку
Комін дужа ёсць высокі.
Як плюецца дымам ён,
Дзе дастаць мне парасон?
Ой ты, Мядзелка-рачушка,
Прашапчы ты нам на вушка,
Чаму ж ты засумавала,
І вадзіца мутнай стала?
А таму сумую я,
Што не чую салаўя,
Ад мазуту дзе мне дзецца —
Разбівае бруд мне сэрца!
Ой ты, Мядзелка-рачушка,

Прашапчы ты нам на вушка,
Чаму ж ты так абмялела,
Ды на што ты захварэла?
На прастор хачу прабіцца,
Напаіць вадой зямліцу.
Сціснуў горад берагі,
Ой, пamру я ад тугі!
Ой ты, Мядзелка-рачушка,
Не шапчы нам больш на вушка,
Цябе цяжка суцяшаць,
І яшчэ цяжэй спяваць!

Млын мінулі, бачым лазню,
Праз раку — стары масток.
Ой ты, бераг непралазны!
Дзе ж, рачулка, твой выток?
Ля РАНА прафорга бачым,
Агарнуў жанчыну стах:
"Мост слабенькі скрыпіць-плача,
У ваду не глянеш — жах!
Ой, калегі, памагайце,
Мы на востраве жывём.
Як Мазай і куча зайцаў,
Ды інструкцыі грызём".
Прыбіралі смецце, палкі,
Бачым раптам: што за цуд?
А з вады ідуць русалкі,
На хвастах танцуюць тут!
Гучыць песня "Танец русалак" на мелодыю "Бастангі":

Рыбахова едзе ў госці,
Браканьеры едуць у госці.
Гаспадарыцьхто у доме?
Здагадаецеся после.
Што вам скажам, што параім —
Парабчанкі мы ускраін.
"Памажыце! — мы вас просім, —
Пад вадой не лета — восень".

Прыпеў: Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!

Шклянка вось, кавалак дроту,
Хлам плыве з-за павароту,
Выкідае смецце горад,
Пад вадой — страшэнны холад…

Прыпеў: Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!

Ды ўсю праўду раскажы!

Ах, як сумна нам, хвастатым,
Без Нептуна, як без таты.
Ён уцёк далей адгэтуль,
Ні слядоў, ані прывету.
Мы ж да млыну толькі ходзім,
З рыбакамі карагодзім.
Ўсю луску з'ядае бруд,
Як пражыць, скажыце, тут?

Прыпеў: Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!
Памажы, памажы!
Ды ўсю праўду раскажы!

Як пачулі танец гэты,
З плошчы проста да ракі
Падышлі, як два паэты,
Экалогі-дружбакі.
І сказаў сын Яраславаў?
"Я не дворнік тут, а пан!"
Юр'еў сын кіўнуў: "Ой, мала
Ціскаў вас Нептун за стан!
Бачым самі недахопы,
Чатырох не хопіць рук
Парушальнікаў прыхлопнуць,
Каб не бачыць рэчкі мук".
Ўсё інспекцыя сказала,
Крочыць наш атрад далей.
Беражкамі да вакзала,
Дзе і смецяць ўжо смялей.
Бытавыя адыходы
Валяць людцы у ваду.
"Тут не ходзяць параходы,
Тут не шлях у Катманду!" —
Так сказала цётка Анця,
Сыпануўшы штось з вядра, —
На заводзе лепей гляньце,
Вось дзе кідаюць "дабра"!
Іх мазуцік адмысловы
Рыбкі п'юць са дня у дзень.
Што, турысты, невясёла?
Акуляры хоць надзень!"
Засталася ззаду баба,
Мы прайшлі праз МСО.
Разняла русалка жабры:
"Дзе знайсці мне H2O?
Царскасельскія палацы
Паліваюць агарод.
Кожны дзень па кроплях плачу,
Не трапляюць кроплі ў рот!
Паплыву лепш у Заброддзе,
Да вясковых мужыкоў.
Калі жыць — дык жыць ў народзе,
Хай не рэчка там, а роў!"

Падмігнула дзева вокам,
Паплыла да мужыкоў.
Раптам з Пашам знікла Іна
Пашукаць ля сцежак схоў.
Там мурожная травіца,
Пад кусточкам цэлы рай.
Тут прыйшоў нам час дзівіцца,
Хоць крычы ты, хоць гукай.

Гучыць песня "Сцежачка" на словы Лягчылава, музыка Сацуры.

Тут географ наш азваўся:
"Хопіць, дзеўкі, нам хадзіць!
Бруд у горадзе застаўся,
А рака — шчэ будзе жыць!..".
Ачуняла ранкам веснім,
Сілы возьме ад крыніц.
Паліецца звонка песня
Да вышыняў-таямніц!

Гучыць песня "Я табе ўсё аддам" на мелодыю "Мы желаем счастья вам":
Мядзелка, мы будзем ўсё ж з табой,
Хоць далёка вельмі той прыбой,
Да якога ты бяжыш праз лугі, лясы,
Нам лягчэй з табой у цяжкі час,
Калышы на хвалях звонкіх нас,
Рассцілай на беразе кветак паясы.

Прыпеў: Я табе ўсё аддам,
Каб была паўнюткаю ты,
Надзею дорыш нам,
Каралеўна пекнаты.
Я табе усё аддам,
Над табой развеецца дым,
Калі шчаслівы сам,
Падзяліся тым з другім.

Мы згубілі сёння свой спакой,
Мядзелка, мы будзем ўсё ж з табой.
У дарозе дальняй няхай прысніцца дом,
Бераг родны, жоўты лістапад
І знаёмы, блізкі твой пагляд...
Не знікай ніколі ты, саграваі цяплом.

Прыпеў: Я табе ўсё аддам,
Каб была паўнюткаю ты,
Надзею дорыш нам,
Каралеўна пекнаты.
Я табе усё аддам,
Над табой развеецца дым,
Калі шчаслівы сам,
Падзяліся тым з другім.

**Пяю маю Айчыну**
**Выступленне настаўнікаў СШ № 1 на раённым аглядзе-конкурсе калектываў мастацкай самадзейнасці "Пяю маю Айчыну..."**

Першы вядучы:
Калі да Радзімы іду са сваёй любоўю, —
Радзіма ў дыханні і ў кожнай крывінцы жыве.

Другі вядучы:
У песні вяртаецца з самага жорсткага бою,
Над абеліскамі горкай хмурынкай плыве.

Першы вядучы:
Іду да Радзімы, а сэрца трывогу вартуе, —
Радзіма, як хваля, спякоту душы абаўе.

Другі вядучы:
Люляе, як Нарач, і, як Белавежа, гадуе
Пад кронамі дзён абнадзейныя крокі мае...

Першы вядучы:
Радзіма, Радзіма — неразгаданае дзіва:
Заснежжа стагоддзяў на вечназялёнай траве.

Гучыць песня "Беларусь" на словы Леаніда Трубача, музыка Людмілы Логінавай:
Мне не змераць ніяк сініх рэк глыбіню,
Край прыгожых лясоў, светлых мар-летуценняў.
Я заўсёды сустрэну тут радню,
Не злічыць тваіх фарбаў і красак-адценняў.
Прыпеў:
Ціхі гоман ракі, тонкі звон ручайка,
І барвовы туман, і чароўныя ночы.
Прыгажосці тваёй не паўторыць рука
І не знойдзе ніхто, калі вельмі захоча.
Я клянуся пранесці цябе праз гады,
Няхай нават і лёс на край свету запросіць.
І тады буду жыць думкай я пра цябе,
Буду помніць твае ясназорыя ночы.
Прыпеў.
Край азёр і лясоў, край лугоў і палёў,
Да якіх жытні колас пяшчотна хінецца.
Ад бярозак тваіх ва ўсім свеце святлей,
Можа быць, ты таму Беларуссю завешся.
Прыпеў.

Першы вядучы:
Вечар у Ялце. Настыла папера.
Не падыходзіць паэт да акна.
А над Ай-Петры смуткуе Венера,
Як пры Максіме — адна.

Другі вядучы:
Максіме, Максіме, жыве твая Вера
З абуджаным імем — Вясна.

Першы вядучы:
Зорка Кахання і зорка Расстання —
Помнік паэтавай горкай душы:
Полымя памяці — не, не растане

Ў зорнай касмічнай цішы!

Другі вядучы:
Максіме, Максіме, ў краіне — світанне:
Скажы сваё слова, скажы!

Першы вядучы:
Вечныя — песня, любоў і радзіма.
І несмяротнасці верны зарок —
Слова Максіма і зорка Максіма,
Зоркі пранікліва зрок.

Другі вядучы:
Максіме, Максіме, за бухтаю сіняй
Звініць твой абуджаны крок.

Выконваецца песня “Хмары” на словы Максіма Багдановіча, музыка Людмілы Логінавай.

Першы вядучы:
Слёзным дажджом праліліся бяздольныя хмары,
Вецер-зламыснік ім зліцца не даў у каханні.
Можа і праўда, што гінуць высокія мары…
Можа і праўда, што моцы не маюць жаданні…

Другі вядучы:
Не, нездарма ёсць на свеце грымоты з дажджамі,
Не, нездарма так напорна шумяць навальніцы.
Болем-слязмі напаўняюцца чашы ў храме
Тым, хто ідзе, каб за родны свій край памаліцца…

Гучыць песня “Налі пацір слязьмі” на словы Ігара Пракаповіча, музыка Міколы Яцкова.

Першы вядучы (жанчына):
Ах, песня маці! Я не чую стомы,
Забылася на млявасць, што звяла.
Вяртае нас сцяжыначка дадому,
У бацькаў двор, да любага сяла.

Другі вядучы (мужчына):
Там на траве бялеюць ранкам росы,
Там кладкі выгнутыя над вадой,
Там я калісьці — загарэлы, босы —
Каня паіў з дзяўчынай маладой…

Першы вядучы (жанчына):
Дыхне вятрыска — лёгка стане,
Пачуеш лесу пошум, плёскат рэк…
Мой родны край, мая зямля спявае,
Мая любоў, адзіная навек!

Другі вядучы (мужчына):
Я быццам п’ю, прыпаўшы ніцма
Да ручая з крынічнаю вадой…
Мы часта ў спёку ходзім паўз крыніцу,
Але ці часта п’ём з крыніцы той?

Гучыць песня “Ці свет, ці світае”:
Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае,
Ці мой міленькі, голуб сівенькі
Коніка сядлае.
Сядлай, мілы, каня,
Каня вараненькага,
Прыязджай, мілы, не кідай, мілы,
Мяне маладзенькую.
Ці ж я не такая,
Як і тая другая?
Я й харошая, я й прыгожая.
Мая доля ліхая.
Ой, у полі азерца,
Там плывала вядзерца.
Ой, прыйдзі, мілы, дый й парадзімся,
Маё мілае сэрца.

Першы вядучы:
І нашы песні даўнія і скокі
Стваралі продкі для сябе саміх.
Яны ж нясуць і сёння ў свет шырокі
Імя зямлі, што акрыліла іх.

Другі вядучы:
Калі табе цяпер патрэбны ўрокі —
Дык вось адзін: старайся гэтак пець,
Каб дом свій родны песнямі сагрэць —
Тады пачуе іх і свет шырокі!

Гучыць песня “А ў нашай вёсцы”:
А ў нашай вёсцы не было вяселля,
Не было ды не было,
Ды ніколі не будзе.
Зарастае вёска гарамі, барамі,
Зарастае наша вёска гарамі, барамі.
Зарастае вёска гарамі, барамі,
Гарамі, барамі ды крутымі берагамі.
Із-пад горкі дзяўчына вадзіцу насіла,
Із-пад горкі дзяўчына вадзіцу насіла,
З вядзёр вада льецца, з вядзёр вада льецца,
З вядзёр вада льецца, дзяўчына смяецца.
Не з таго смяецца, ды што вадзіца льецца,
Не з таго смяецца, ды што вадзіца льецца,
Хлапчучок кудравы, хлапчучок кудравы,
Хлапчучок кудравы на яе ў акенца глядзеў.
А сама дзяўчына, а сама дзяўчына,
А сама дзяўчына не вялічка ды маленька,
А сама дзяўчына, а сама дзяўчына
Невялічка маленька, у касе лента аленька.
Сама чарнаброва, сама чарнаброва,
Сама чарнабровая, на ёй шубачка бабровая.

Першы вядучы:
Тут, дзе кружыла буслінае пер’е,
З далёкіх дарог ачынаюся.
Лёзная хваля, чабаровы бераг,
Да вас прытуляюся.

Другі вядучы:

Моцы душэўнае і непакорны
Тут, ля бароў, набіраюся.
Песні, што роджаны шчасцем і горам,
Да вас прытуляюся.

Першы вядучы:
Весніцы зольныя, любыя вочы,
Я зноў перад вамі з'яўляюся.
Сосны, што помняць гаючыя ночы,
Да вас прытуляюся.

Другі вядучы:
Птушкі і воблакі, зоры, крыніцы,
Зямля векавечных сустрэч —
Белая Русь! Як вясну-чараўніцу,
Прашу: ад сябе не адпрэч.

Гучыць песня "Запаліце мне ціхую зорку" на словы Ігара Пракаповіча, музыка Міколы Яцкова.

Першы вядучы:
Нашым продкам — во была мабільнасць! —
Выпадала тут яшчэ да дня
Па дарозе з Полацка на Вільню
Памяняць стамлёнага каня.

Другі вядучы:
Млын. У сене перацёртым плошча.
Клёны ў медных шлемах ля ракі.
І бары высокія палошча
Вецер — спадарожнік гаваркі.

Першы вядучы:
Нам адолець шлях той — не праблема.
Млын не меле… Коней не чуваць…
Але вы прыгледзьцеся: у шлемах
Клёны старажытныя стаяць!

Гучыць песня "Ноч у Паставах" на словы Ігара Пракаповіча, музыка Людмілы Логінавай.

**Запрашаем у Паставы**
Выступенне краязнаўчага калектыву

Патрыёт:
Глядзіце, вось яны — цудоўныя Паставы,
Маленькі гарадок пад сонечным блакітам.
Царква, касцёл на берагах стаяць яскрава,
Мінуўшчыну да нас яны нясуць нібыта.
І хоць зіма спраўляе баль з завеяй, сцюжай,
Вядуць шляхі здалёк да твайго, горад, сэрца.
Тут нават самы слабы стане хутка дужым
І заспявае, каб не даць душы памерці.
Гады ідуць, і горад прыгажэе з часам,
Нібы вярнуў сабе другую маладосць.
Вандроўнікаў ён сустракае раз за разам,
Бо паказаць што мае, шмат чаго тут ёсць!
Турысты мапы разгарнулі: вось Паставы,
Тады шукаюць Полацк, Мінск, Варшаву, Вільню,

І дробязь іншую накшталт Масквы, Палтавы,
Вітае свет наш гарадок усеабдымны.
Аэрапорт “Азёркі” лайнеры прымае,
Па Мядзелцы плыве “Тытанік” № 2…
Цягнік стралою ад вакзала адлятае,
Ад захаплення кругам ходзіць галава.

Гучыць песня “Мае Паставы — сінявокі небасхіл”.

Скептык з залы:
Э, брат, пастой, даволі дзіўных сказаў,
Куды цябе панёс гуляка-вецер?
Я з залы так табе скажу адразу:
Ёсць іншыя мясціны ў гэтым свеце!
Ты у аблокі надта заляцеў
І сам не бачыш, як хлусіць пачаў,
Спыніць цябе тады я захацеў,
Як ты лунаў вакол сваіх Пастаў.
Я так скажу: твой горад — у мінулым,
Турыст не едзе ў гэту глухамань,
Тут нават куры ў вулачках паснулі,
Тут толькі сум і шэрань, дзе ні глянь!
Ну, што, маўчыш, не маеш апраўдання?
Ці праглынуў язык ты ад здзіўлення?
Гісторыю мы знішчылі дазвання,
Няма чаго успомніць пакаленням!

Патрыёт выклікае скептыка да сябе на сцэну і пачынае даказваць сваю ісціну:
Ну, не, здавацца проста не прывык я,
Турыст і ў Афрыцы турыстам будзе!
Хоць для цябе праект мой і нязвыклы,
Але ж ён цішу сонную абудзіць!
Хадзі, браток, сюды, на гэту сцэну,
У спрэчцы вырашым свае пытанні.
Я адваката вопратку надзену,
Ты ж пракурорам вопытным паўстанеш.
Ну, што ж, пачнем працэс наш гістарычны,
Каб зняць усе праблебныя пытанні.
Паставы — горад вельмі сімпатычны
І цёмным вечарам, і светлым раннем.

Скептык:
Ці ёсць успомніць што ад тых стагоддзяў,
Што ў лету канулі, бы бот ў балота,
Мужык гібеў на панскім агародзе,
А лапаць з кайстрай — сімвалы галоты…

Патрыёт:
Шэсць соцень летаў з тых часін мінула,
Калі Пасаднік ў свеце загучаў.
Яго сярэднявечча не сагнула,
Ў Літоўскім княстве горадам ён стаў.
І герб свій маем — рыбкі залатыя
У невад мкнуцца, свецяцца ў блакіце,
То Мядзелка ад веку твары мые,
Вы спрэчкі пра гісторыю пакіньце!

Скептык:

Так проста, браце, я табе не здамся,
Хоць фактаў ведаеш усё ж нямала.
А болей што, маўчыш у нейкім трансе?
Цябе ж гісторыя і даканала!

Патрыёт:
Ну, што ж, хацеў ты большага — дзівіся,
Глядзі на сведкаў часу, што прыйшлі.
Ад зайздрасці ты толькі не ўдавіся,
Цябе нашчадкі потым каб знайшлі.
Вось Тызенгауз ідзе шырокім крокам,
Глядзіць на нашу спрэчку з вышыні.
Паэт Дубоўка вырваўся са змроку,
Друцкі-Любецкі, Ромер — нашы карані.
Яны падмурак клалі адмысловы
Пад наш пастаўскі родны, цёплы дом,
Нам — доўжыць іх святыя справы, словы
І гонар мець, што вучымся, жывём.

Скептык:
І ўсё ж хачу яшчэ пераканацца,
Хоць мой знікае крыху недавер.
Я не хачу так лёгка, проста здацца,
Ты, адвакат пастаўскі, мне павер.

Патрыёт:
Для пракурора доказы — работа,
Глядзі на ўсё, любуйся краявідам,
А пагаворым з табой разам потым,
Мясцовыя шэдэўры калі выдам.

Скептык:
Усё, ляжу я, браце, на лапатках,
Аповед твой мяне пераканаў,
І ўсё ж стаіць паходная палатка,
На паўпрацэнта ўсё ж не даканаў!
Мінуўшчына сівою цёткай стала,
Былым хваліцца нeяк не з рукі.
Што сёння ёсць, а можа, вельмі мала,
Як той вады ад Мядзелкі-ракі?

Патрыёт:
Пара прысуд выносіць ў нашай спрэчцы,
І ты, нявера, зноўку падзівіся.
Людзям вады хапае ў нашай рэчцы,
Паслухай,глянь, душою падзівіся!
Вось так звіняць цымбалы і гармонік,
Гасцей збіраючы на цуда-свята.
Гучалі сотні полек тут, “Лявоніх…”,
Музыкаў, спевакоў было багата.
А колькі ёсць мясцовых дыяментаў,
Іх сёння цяжка нават палічыць!
А “Паазер’е” знішчыць сум дашчэнту,
Душа да зор, здаецца, паляціць!

Скептык:
Маўчу, нямею, капялюш здымаю,
Хапіла доказаў па вушы мне.
Да нас экскурсіі я запрашаю —
Турысцкі рух ў Паставах не засне!

**Гуканне вясны**

На месцы правядзення мерапрыемства стаіць вярба
Усе дзеці прыходзяць на свята ў вяночках і трымаюць у руках саламяныя і папяровыя птушкі.
На пляцоўку выходзяць дзеці. Яны ідуць павольным крокам з песняй “Вясна, вясна на калочку…”. Накіроўваюцца да вярбы і, спяваючы, упрыгожваюць яе вяночкамі, кветкамі, стужкамі.

Першая дзяўчынка: (звяртаецца з паклонам) Ці дазволіце, добрыя людзі, вясну клікаць, зіму праважаць, лета дажыдаць?

Другая дзяўчынка: (кажа замову да сонца)
Красна сонца, ясен свет, і з лунамі яснымі, і з звёздамі
частымі, і з вясенні́м цяплом, і з летнім агнём, і ўгрэй, упар зямлю, распусці зялёную траву!
Трэцяя дзяўчынка:

Вылеці, пчолка ярая,
Вынесі залатыя ключыкі,
Замкні халодную зіманьку,
Адамкні цёплае лецейка!

Усе ўдзельнікі збіраюцца ў карагод вакол дрэва пад песню “Ты, пчолачка ярая…”.

Першая дзяўчынка: Благаславі, Божа,
Вясну-красну пеці,
На ціхае лета,
На буйное жыта.

Другая дзяўчынка: Каб наша жыта
Ў трубы павілося,
У трубы павілося,
Набок схілілася.

Трэцяя дзяўчынка: На полі снапамі,
А ў гумне тарпамі,
На таку ўмалотна,
У арудзе прысыпна,
А ў млыне прымольна
А ў дзяжы падходна,
А ў печы пячыста,
А на стале краіста.

У гэты час на пляцоўку выходзіць дзяўчына ў прыгожай сукенцы (Вясна) і хлопец у лахманак (Зіма). Яны вітаюцца.
Зіма: Ой, чалом, чалом, ды цёплае лецечка!
Вясна: Ой, здарова была, ды халодная Зімачка.

Зіма: Што цябе, Лецейка, узвелічаюць,
Мяне, Зімачку, праклінаюць?

Вясна: Бо ты, Зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла,
Ой, я, Лецечка, ды вясёлае,
Лугі, горы ўзвесяліла,
Лугі, горы ізмачыла.

Першая дзяўчынка: Згінь, Зіма, ты нядобрай была!

Другая дзяўчына: Адыдзі, Зіма, ты мокрай была!

Трэцяя дзяўчына: Згары, Зіма, ты нямой была!
Пусці Вясну на зямлю маю!

Зіма, павярнуўшыся вакол сябе, уцякае. Да Вясны падбягаюць дзяўчынкі і пытаюць:

Дзяўчынкі: А ты, Вясна, а ты, красна,
Што ты там прынясла?

Вясна: А прынясла я вам
Цёплае лета ціхае,
І цёплую вадзіцу,
З зямлі травіцу.

Хлопчыкі: А ты, Вясна, а ты, красна,
Што ты там прынясла?

Вясна: Пастушкам па кіёчку,
А дзевачкам па вяночку.

Усе водзяць карагод і спяваюць песню “А ў лесе, лесе…” З другога боку пляцоўкі з’яўляюцца валачобнікі. Яны спяваюць, граюць, б’юць у бубен.

Першы валачобнік: Ой, барамі сасновымі,
Ой, палямі жытнёвымі

Другі валачобнік: Ідуць, ідуць валачобнікі,
Гукаючы, спяваючы….
Трэці валачобнік: Валачобнікі валачыліся,
Валачыліся, намачыліся.

Чацвёрты валачобнік: А за чый жа двор зачапіліся?

Усе разам: Да за ваш двор зачапіліся.

Валачобнікі спяваюць песні, скачуць танец. Іх здорваюць яйкамі, печывам. Затым валачобнікі прапаноўваюць пахадзіть па хатах.

Ой, ці дома пані гаспадыня?

Гаспадыня: Дома, дома!

Валачобнікі: Хазяйка, хазяйка,
Кідай сваю пражу.

Зіма ўжо прагнана,
Адчыняй свае дзверы,
Заві нас у госці!

Гаспадыня: Заходзьце, добрыя людзі!
Дзякуй за добрую навіну!

Першы валачобнік: Валачобнікі – не дакучнікі.

Другі валачобнік: Не часта ходзяць, не дакучаюць.

Трэці валачобнік: У гэты гадочак – адзін разочак!

Усе разам: Частуй нас, гаспадыня, за тое,
Што вясну паклікалі!

Гаспадыня: Каб пачаставаць, трэба спачатку заспяваць,
Павесяліць нас, бо без падпалу і дровы гараць!

Валачобнікі спяваюць прыпеўкі. Гаспадыня частуе гасцей птушачкамі з цеста.

Першы валачобнік: Дзякуй, гаспадыня, за пачастунак, пойдзем далей,
панясём добрую навіну іншым людзям!

Другі валачобнік: Жадаем, каб дзяды не ведалі бяды,
А ўнукі не бачылі мукі.

Трэці валачобнік: Каб былі здаровы,
Як дуб скарбовы!

Валачобнікі ідуць далей, а дзеці пачынаюць гуляць у розныя гульні, наладжваць спаборніцтвы.

**Фальклорнае свята “Юр’я”**

Па-святочнаму апранутыя дзяўчынкі і хлопчыкі выходзяць на сцэну двума гуртамі: наперадзе першага, які складаецца толькі з дзяўчынак, ідзе хлопчык з пірагом, у які ўваткнута галінка і харугва (сцяжок) з чырвонага палатна, за імі ідзе група толькі з хлопчыкаў. Усе яны пачынаюць шэсце з першымі словамі і словамі песні:

Ідзе, ідзе карагод, карагод,
Усе дзевачкі напярод, напярод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.
Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.
У нашага карагода
Быў сын ваявода.
Дзе карагод ходзіць,
Там жыта родзіць,

А дзе карагод бывае,
Там жыта вылягае.
У нашага карагода
Быў сын ваявода.
Ідзе, ідзе карагод,
Усе дзевачкі напярод,
А хлопчыкі за намі,
Маргаючы вачамі.

Такім чынам, спяваючы, яны некалькі разоў абыходзяць сцэну. Потым хлопчыкі адыходзяць, на сцэне застаюцца дзяўчынкі. Яны выбіраюць адну, прыгажэйшую, упрыгожваюць яе вянком з кветак, садзяць на лаўку і кладуць побач з ёй хлеб, яйкі, сыр, масла, гладыш з малаком ставяць. Адначасова з гэтым заняткам яны напяваюць словы:

Блаславі, маці,
Ой, Лада, маці,
Вясну заклікаці…

Яны (дзяўчынкі) бяруцца за рукі і скачуць у карагодзе ля абранай дзяўчыны, спяваюць у яе гонар песню:

Дай нам жытцу ды пшаніцу,
У агародзе — сенажаць,
Поўны грады, поўны зрады,

(напеў песні працяжны, пасля кожнага радка падпяваюць: "Ляля, Ляля, наша Ляля!"). Скончыўшы спяваць і танцаваць, дзяўчынкі садзяцца ля ног Лялі (Вяснянкі) і пачынаюць зноў спяваць:

Наша Ляля, Ляля
Нас корміць усім,
Каб з вясны да лета
Усё, што тут гэта,
Гадавала ўсім.
Ляля, Ляля,
Ой, да Ляля, Ляля!

Потым Ляля (Вяснянка) раздае дзяўчынкам па чарзе малако, масла, сыр, хлеб, пакуль нічога не застанецца. Усе разам яны пакідаюць сцэну, ведучы пад рукі Лялю.

Зноў з'яўляецца адна Ляля і кажа такія словы:

Юр'я, вазьмі ключы залатыя,
Адамкні зямлю сырусенькую,
Пусці расу мядовую
На траву шаўковую,
На ўраджай, на ўсякі цвет,
На Белую Русь і на ўвесь свет.

За яе апошнімі словамі выходзіць хлопчык — Юр'я ў белай вопратцы, у плашчы-накідцы. На галаве вянок, у руцэ — пастухова торба і жменя каласоў жыта. Следам за ім ідуць і хлопчыкі ў сялянскім адзенні. Вяснянка падае Юр'ю сімвалічныя ключы. Ён бярэ іх з паклонам і цалуе. Адзін з хлопчыкаў пытаецца:

Слаўны наш Ярыла — Юрый,
Дзе ж ты бываў?

Юр'я адказвае ўсім:

Я па полі хадзіў,
Людзям жыта расціў,

Я ля бору хадзіў,
Людзям пчолкі збіраў,
Я па хатках хадзіў,
Людзям шчасце насіў.
У размову ўступае Вяснянка:
Ой, выду, выду на вуліцу,
Дый гляну, гляну ў чыста поле,
А ў чыстым полі агонь гарыць.
Нам Юр'я агонь паслаў,
Да ўсіх дзевачак к агню сазваў.
Хадземце, дзевачкі, хадземце, мілыя,
Да агню.
Усе ўдзельнікі збіраюцца да аднаго месца (сімвалічнага вогнішча), робячы паўкруг. Хлопчык-пастушок (з пугай праз плячо) выбірае хлапчукоў для гульні і кажа ім: "Ты ў нас будзеш "зайцам", ты — "сляпым", ты — "кульгавым", ты — "замком", а ты — "калодай". Гуляем!". Пастушок звяртаецца да абраных па чарзе і пытаецца, стукаючы (ляскаючы) пугай па сцэне.
Пастушок: Заяц, заяц, ці горка асіна?
"Заяц": Горка!
Пастушок: Дай Бог, каб і наша скацінка для звяроў была горка!
Звяртаецца да "сляпога".
Пастушок: Сляпы, сляпы, ці бачыш ты?
"Сляпы": Не бачу!
Пастушок: Дай Бог, каб і нашу скацінку не бачыла звярынка!
Пытаецца ў "кульгавага".
Пастушок: Кульгавы, а кульгавы, ці дойдзеш ты?
"Кульгавы": Не дайду!
Пастушок: Дай Бог, каб і звярынка не дайшла да нашай скацінкі!
Гаворыць "замку".
Пастушок: Замок, замок, ці разамкнеш ты?
"Замок": Не, не разамкнуся!
Пастушок: Дай Бог, каб у звера не разамкнуліся зубы ля нашай скацінкі!
Апошнім пытаецца ў "калоды".
Пастушок: Калода, а калода, ці павернешся ты?
"Калода": Не павярнуся!
Пастушок: Дай Бог, каб і звер не павярнуўся да нашай скацінкі!
(Пытанні і адказы можна ажывіць рознымі рухамі і жэстамі ўдзельнікаў размовы).
Пасля Вяснянка з паклонам пытаецца ў Юр'я:
Святы Юрый, дзе ж ты бываў, дзе ж ты прабываў?
Юр'я адказвае нараспеў, робячы шырокія жэсты рукамі, быццам паказваючы:
У самачэснага мужа ў Раманічка,
Я кароў пасціў і запасаў,
А, запасціўшы, дамоў прыганю,
Дамоў прыганю, у хлеў заганю.
У хлеў заганю, слаўцо згавару.
Гэтаму статку не будзе ўпадку
Ні ад мядзведзя, ні ад нарову,
Ні ад гада бягучага,
Ні ад змея лятучага.

Вяснянка звяртаецца да хлопчыкаў і дзяўчынак, пытаецца іх:
Што нам Юр'я гаворыць, што нам святы кажа?
Тыя гавораць, звяртаючыся адзін да аднаго, быццам расказваючы толькі ў пары.
Дзяўчынка: Як дождж на Юр'я, то будзе хлеб і ў дурня.
Хлопчык: Юры сказаў: жыта ўрадку, Мікола адказаў: пажджы, пагляджу.
Дзяўчынка: Як на Юр'я пагода, то на грэчку няўрода.
Хлопчык: Калі на Юр'я мароз, дык на балоце авёс.
Дзяўчынка: Калі прыйдзе Юры, не ўгледзіш у жыце куры.
Хлопчык: Юр'ева раса — не трэба коням аўса.
Наперад сцэны выходзіць адзін з хлопчыкаў і гаворыць:
Разгуляўся Юр'еў конь,
Разбіў камень капытом.
Як у камне зерне ёсць,
Так у хлопцаў праўда ёсць.
Разгуляўся Юр'еў конь,
Разбіў арэх капытом.
Як у арэху зерне ёсць,
Так у дзяўчынак праўда ёсць.
З апошнімі словамі хлопчыка да яго выходзіць дзяўчынка, бярэ яго за руку і з усмешкай кажа:
Яго конік хваслівы:
Хвастом вулку падмяце,
Юр'ю паненку правядзе,
Вушкамі неба падапрэ,
Вочкамі зоры палічыць,
Цябе маладога падвялічыць.
Юр'я падыходзіць да Вяснянкі і запрашае яе ў карагод, усе танцуюць і спяваюць разам:
Юр'я, устань рана,
Юр'я, мыся бела,
Юр'я, ідзі ў стайню,
Юр'я, сядлай каня,
Юр'я, едзь у поле,
Юр'я, адамкні зямлю,
Юр'я, пусці расу,
Юр'я, цяпленькую,
Юр'я, бяленькую.
Скончыўшы спяваць, усе разам, узяўшыся за рукі, кланяюцца гледачам. У цэнтры — Юр'я з Вяснянкай.

**Вечар беларускага гумару "Смяяцца не грэх..."**

Перад пачаткам вечара гучаць песні ў выкананні "Песняроў". На сцэну выходзяць ЁН і ЯНА.

ЁН:
"Мой родны кут, як ты мне мілы..." —
Пісаў калісьці Якуб Колас.
"Забыць цябе не маю сілы..." —

Здалёк гучыць той чысты голас.

ЯНА:
І мы, як праўнукі-нашчадкі
Той запавет нясём у людзі.
Яшчэ не ўсё ідзе ў нас гладка
І хтосьці без Радзімы блудзіць.

ЁН:
Усё ж не вечна быць у сцюжы,
Насустрач дзень ідзе вясновы,
Ён думкі, словы нашы кружыць
І водар дорыць адмысловы.

ЯНА:
І Беларусь квітнее зноўку
Сярод краін, дзяржаў заможных,
І мову нашу, як сяброўку,
Прызнаў і самы асцярожны.

ЁН:
Здаецца, добра ўсё, цудоўна,
Адпачывайце, беларусы.
Але не-не, ды усё роўна
Пачуеш галасы прымусу.

ЯНА:
Хоць лічым роднаю, сваёю,
Ды гаварыць не вельмі хочам
І беларускасць ўсю з крывёю
З сябе здзіраем ды рагочам.

ЁН:
Дык хто мы будзем тады ў свеце?
Ніколі ж здраднікаў не песцяць!
Кім назавуцца нашы дзеці,
Калі народ за слова бэсцяць?

ЯНА:
Казаў Купала, што тутэйшасць
Не прынясе даброт нікому.
Лічыць чужое за вышэйшасць —
Што здрадзіць маці роднай, дому.

Вучаніца чытае верш “Гавары па-беларуску, чалавек...” (друкуецца ў першым раздзеле кнігі).

ЁН:
Купала, Колас, Багдановіч,
Дубоўка, Жылка і Гарэцкі,
Аленка, Сцёпка, Лабановіч,
Васіль і Ганна, Беларэцкі...

ЯНА:
Пісьменнікі, героі твора...
Той пералік прадоўжыць можна,
Ты ж сам сабе зусім не вораг,
Хоць размаўляеш асцярожна.

ЁН:

Ну, хто сказаў, што горад рускі,
Што беларусу жыць там цяжка?
Няўжо КАШУЛЯ будзе вузкай,
А добра будзе ЛИШЬ РУБАШКА?

ЯНА:
Як той хлапчук, што з вёскі з'ехаў
І паказаць вучонасць хоча:
Ён на кітайскай мове б "шпрэхаў",
Каб ПАРНЕМ быць, але не ХЛОПЦАМ.

Вучаніца чытае верш Ніла Гілевіча "Роднае слова".

ЁН:
Ды ўсё ж бліжэй, бліжэй да тэмы,
Пара паслухаць гукі мовы.
На памяць вучым тэарэмы —
А пасмяяцца ці гатовы?

ЯНА:
Народных жартаў вельмі многа,
Нібыта зоркі ў небе свецяць.
Гудзе вясельная дарога,
Заручынаў чакаюць дзеці.

ЁН:
Тут цілі-цілі, цілі-цеста,
Жаніх на справаў безліч здатны,
Ты не сумуй, краса-нявеста,
Жыццё ў вас будзе хай выдатным!

ЯНА:
Звінелі чаркі ўвосень звонка,
Жыццё бруілася крыніцай.
Яшчэ дзяўчына ты, не жонка,
Дык не сумуй жа, маладзіца!

Вучань чытае верш Сяргея Панізьніка "Ідзе восень у Паставы".
Пасля верша — сцэнка "Заручыны".

ЁН:
Усё. Вяселле адгрымела,
Жывуць шчасліва маладыя,
І ўспамінаюцца нясмела
Спатканні, ростані былыя.

ЯНА:
Калі шумелі жартаў хвалі,
Было дзяўчат і кавалераў.
Хадзіць ля хаты перасталі,
Але ж было — каб хто паверыў.

ЁН:
Дарослым стаць мы вельмі хочам,
Здаецца — гэта бездань шчасця,
А помняцца юнацтва ночы,
Якім, Паўлінка, Коля, Насця...

ЁН:
Дарослым стаць мы вельмі хочам,
Здаецца — гэта бездань шчасця,
А помняцца юнацтва ночы,
Якім, Паўлінка, Коля, Насця…

ЯНА:
Але ж наперад час імкнецца,
Усё далей часы спаткання…
Пакуты стомленага сэрца,
Хвіліны чыстага кахання…

Чытаецца верш Сяргея Панізьніка “Водсвет Нарачы, шум Белавежы…”. Пасля — сцэна з п’есы Янкі Купалы “Паўлінка”.

ЁН:
Эх, беларусы, цяжка з намі,
Сабе ствараем перашкоды,
Ніколі ж не былі панамі,
Усе мы — выхадцы з народа.

ЯНА:
Сварыцца — дык на поўны грудзі,
Кахаць — дык так, каб дух заняла.
Жар-птушку любай ён здабудзе,
А ёй здаецца — пер’я мала.

ЁН:
Хлапцы злуюцца —дзеўцы смешна,
Натура ўжо ў яе такая.
Хаця бывае не бязгрэшнай,
А ўсім раскажа — залатая.

ЯНА:
Ды што мілей за беларусак
Магло і быць на белым свеце?
Ці прыгажэй ад косаў русых
І ад вачэй, што ясна свецяць?

ЁН:
Адама Ева падманула,
І з той пары мужчыне цяжка:
Яго каханне так сагнула,
Што ўжо не вабіць нават пляшка.

ЯНА:
Зноў барацьба ідзе, змаганне,
Палонных тут ты не убачыш.
Сыходзімся у бітве за каханне —
А як жа можа быць іначай?

Сцэна з п’есы “Мікітаў лапаць” Міхася Чарота.

ЁН:
Ну, што, сябры, ці зразумелі,
Аб чым ішла ў нас тут размова?
Напэўна, так, бо ўсе хацелі,
Каб родная гучала мова.

ЯНА:
Калі сказаць захочаш слова,
Успомні: ёсць твая Радзіма,
І ты не проста нейкі Вова,
А беларус ты — Уладзімір.

ЁН:
Сваё бліжэй да сэрца ляжа,
Вадой жывой загоіць раны,
І беларус усім дакажа,
Што забываць яго шчэ рана.

ЯНА:
Дык будзьце ж роўнымі між роўных,
Імя сваё не забывайце,
З чужых шляхоў да сцежак родных
Часцей прыходзьце, прыязджайце!

## 3. У ВЯНОК ЛЕАНІДУ ТРУБАЧУ

Таццяна Трубач

**Памяці таты**
Зірну на партрэт — і слёзы міжволі
Растопяць цяжкую маўклівасць вачэй.
Як жудасна тут, хачу я з табою
Туды, дзе няма такіх чорных начэй.

Я плачу, прашу, я малю: адгукніся!
Застанься на хвілю, мяне забяры!
Куды ж ты спяшаеш? Спыніся, спыніся!
Адказ мне: "Забраць не магу да пары...".

Якая пара?! Мы зараз, мы разам
Уздымемся і ў вышыню палацім.
Ты кажаш: "Не сёння, а іншым як часам,
А там цяпер трэба, каб я быў адзін...".

Ігар Пракаповіч

**Развітанне**
*Памяці Леаніда Трубача*
Птушкі вяртаюцца з выраю,
Ты адлятаеш у рай.
Сумнай тугой жураўлінаю
Плачуць нябёсы: "Бывай...".
Болем, жалобаю беруцца
Душы радні і сяброў.

Лёня, папраўдзе, не верыцца,
Што не сустрэнемся зноў.
Брама адкрылася вечнасці,
Сэнсу не мае ўжо час.
Ты, як заўсёды, з усмешкаю
Больш не увойдзеш у клас.
Слова тваё беларускае
Вучні не змогуць пачуць.
…Ў небе палоскаю вузкаю
Сумныя птушкі плывуць…

Мікола Хаўстовіч

**Ты годна нёс сваю беларускасць**

*Памяці Лёні Трубача*

Балюча пісаць быў…

Мая свядомасць ніяк не пагаджаецца ўявіць свет без цябе. І мае на гэта сваё неаспрэчнае права: не бачыў, як апускалі цябе ў магілу, дык ты ўсё яшчэ застаешся ў тым свеце, які існаваў у межах нашых спатканняў-сустрэч і ў маладыя гады, і ў сталым ужо веку.

Вядома, найбольш значнае месца ў тым свеце займаюць нашыя студэнцкія гады. Пачатак 80-х быў ці не самым складаным перыядам для беларускасці ў пасляваенны час. Беларуская філалогія занепадала, на нашым, беларускім аддзяленні адно мова і літаратура выкладаліся па-беларуску. Учарашнія выпускнікі вясковых школ (а іх у нас была большасць) паступова авалодвалі "единым и могучим", каб утульней пачувацца ў грамадстве. Беларускамоўнымі заставаліся хіба толькі паэты, што бачылі сваю будучыню ў літаратуры.

Ты быў чалавекам з гарадской, г. зн. Расійскай школы, але быў беларускамоўным. Меў паэтычныя здольнасці, але пэўныя рысы твайго характару не дазвалялі на поўную сілу заявіць пра сябе як пра паэта. А шкада.

Рабіна, якая ў цябе "кропелькамі сонца птушкам аддае", уяўлялася нам дрэвам сакральным. Дзякуючы табе, тваім метафарам (менавіта тваім, а не запазычаным з мастацкіх твораў) па-іншаму бачыўся навакольны свет, звыклыя рэчы набывалі арэол таямнічасці і святочнасці. Здзіўляла тваё ўменне апаэтызаваць тое, на што мы не звярталі ўвагі. А галоўнае – у тваіх вершаваных радках чуўся гімн роднаму слову, роднай мове.

Мы ведалі, як карпатліва працуеш ты над сваім творам, хоць мала хто з тваіх сяброў і знаёмых мог пахваліцца, што меў "доступ" у тваю творчую лабараторыю. Звычайна, толькі дасканалы, да драбніц адшліфаваны тэкст трапляў на нашыя вочы. Магчыма, гэтыя не вельмі прывабныя перспектывы зацятае катаржнае працы ў версіфікатарстве, а таксама тагачасныя рэаліі, заўважнае змяншэнне абшару беларускасці і скіравалі цябе з пуцінаў высокае паэзіі на шлях прозы, прозы жыцця.

Але ты заўсёды годна нёс сваю беларускасць.

Ці шмат хто з нас можа пахваліцца, што перадаў сваю беларускасць сваім дзецям? А ты, як толькі зразумеў – сам казаў – што дачка гуманітарый, зрабіў усё, каб яна пайшла па тваіх слядах, стала беларускім філолагам.

Лёс з дзіцячых гадоў не быў ласкавы да цябе. Тое, што ў каго-небудзь з нас атрымлівалася лёгка, ты адольваў часам з вялікімі намаганнямі. Не раз будучы падрыхтаваным да экзамену лепш за іншых, меў адзнаку ніжэйшую, чым калегі.

Аднак нішто не магло падважыць тваю сумленнасць, прыстойнасць, добразычлівасць. А такім мы заўсёды бачылі цябе.

Нячастыя пасластудэнцкія сустрэчы паказвалі, што ты заставаўся ўсё такім жа, ранейшым. Адно, можа, стаў больш рашучым, мэтанакіраваным. (Вось бы гэтых якасцей табе раней: упэўнены, беларускае пісьменства мела б сёння знанага паэта).

У апошнюю нашу сустрэчы (верасень 2005 года) мы з табою не змаглі доўга і няспешна паразмаўляць, адно прыгадалі самае надзённае, адкладваючы ўсё менш значнае на іншы раз. А яго ўжо не будзе…

Ты быў…

Ты сёння, як тая рабіна з твайго юначага верша, кропелькамі дасылаеш нам праз кнігу тваіх твораў сваё сонца, свае думкі-мары, блізкія і зразумелыя, бо яны з нашай маладосці, з таго часу, калі ты быў сярод нас і навек застанешся з намі.

**Як крыштальная кропля расы…**

Шчыры беларус. Настаўнік. Паэт. Руплівца роднай мовы. Інтэлігент. Сябар. Калега. Чалавек у самым высокім сэнсе гэтага слова. Таленавіты. Сціплы. Добразычлівы. Справядлівы. Чэсны. Узнёслы…

Яркім і імклівым было яго жыццё. Як Зніч, прамільгнуў ён і пакінуў пасля сябе толькі ўспаміны. Як Максім Багдановіч, жыў напоўніцу, радаваўся кожнаму імгненню. Увасобіў словы любімага Уладзіміра Караткевіча: “Быў. Ёсць. Буду”.

Ён быў сваім. Узгадаваны на пастаўскай зямлі, зачараваны яе прыгажосцю, абмыты вадой гуцкага возера, чысты, як крыштальная кропля расы. І вершы яго былі такімі ж шчырымі, пранікнёнымі, душэўнымі, узнёслымі:

Плыве малітва да вышынь,
Вакол — твае адзінаверцы…
Гары, агеньчык, не астынь
І не давай душы памерці.

І вучняў сваіх Леанід Мікалаевіч выхоўваў сапраўднымі беларусамі. Кажуць, калі памірае ў Сусвеце зорка, мы бачым яе святло яшчэ шмат

гадоў. Зорка Леаніда Трубача яшчэ доўга будзе асвятляць наша жыццё:

Не вечны снег, як і мая дарога,
Але іду, спяшаюся далей…
Настаўнікі беларускай мовы
Пастаўскага раёна
Віцебскай вобласці

Ігар Пракаповіч

**Лёс не даў часу**

Цяжка пісаць пра чалавека, з якім ніколі больш не ўдасца ўбачыцца ў жыцці. Бо яго няма. Ён пайшоў назаўсёды ў той, можа быць, лепшы свет. А тут, у вірлівай мітусні падзей, праблем, стыхій пакінуў нас, а ў нашых душах — памяць пра сябе. І гэта памяць — у рухах, у словах, у інтанацыях, у справах, у адносінах, у вершах… Кожны, хто сустракаўся з ім, размаўляў, вучыўся ў яго, той панёс з сабой па свеце і часцінку яго душы. Не дзіва, што праводзіць яго ў апошні шлях сабралася так многа жыхароў горада Паставы, і прыйшлі яны не па прымусу ці абавязку, а, зноў жа, па душэўнаму парыву, трымценнем тых часцінак душы, якія пакінуў ён у душах знаёмых і незнаёмых людзей.

Лёня Трубач быў адметнай па сваіх чалавечых якасцях асобай. Чулы, спакойны, інтэлігентны, ён да вучняў і да настаўнікаў ставіўся аднолькава далікатна і з усімі падтрымліваў добрыя адносіны. Таму яго многія любілі. Лёня часта ўсміхаўся, любіў пажартаваць, нават пакпіць з каго-небудзь, але рабіў гэта адкрыта, шчыра, па-сяброўску.

І яшчэ адна якасць вылучала яго сярод іншых, рабіла яго прыкметным у настаўніцкім асяродку — гэта яго беларускасць. Не штучная, не фальшывая, як гэта часам здараецца, а натуральная, глыбінная. Паўсюль і з усімі Лёня размаўляў па-беларуску, тым самым працягваючы традыцыі высакароднай нацыянальнай інтэлігенцыі, сваімі паводзінамі і характарам даводзячы знаёмым і калегам, што быць беларусам у Беларусі — гэта ганарова і пачэсна. У адносінах да вучняў ён быў просты і дэмакратычны, не ствараў штучных бар’ераў між сабой і школьнікамі ні на ўроках, ні ў пазаўрочнай дзейнасці. У бурным патоку рускамоўнай адукацыі ён імкнуўся даваць дзецям магчымасць адчуць смак чыстай беларускамоўнай плыні. І гэты смак, гэту павагу да роднай мовы, да роднай культуры многія яго вучні нясуць па жыцці.

Маючы добры мастацкі густ, тонка адчуваючы нюансы чалавечых пачуццяў і жарсцяў, успрымаючы сэрцам хараство прыроды, Лёня спрабаваў перадаць усё гэта ў сваіх літаратурных творах, найперш у паэзіі. На жаль, спадчына ягоных вершаў, якія з’яўляліся ў

часопісах, невялікая, але тое, што вядома з напісанага ім, сведчыць пра несумненны талент гэтага чалавека. Лёня атрымаў добрую гуманітарную адукацыю, навучаючыся на філфаку БДУ; азы літаратурнай творчасці яму пашчасціла атрымаць на пасяджэннях студэнцкага літаратурнага аб'яднання "Узлёт", якім кіраваў вядомы майстар слова Алег Лойка. Вершы Леаніда Трубача з'явіліся на старонках калектыўных зборнікаў, якія выдалі "узлётаўцы": "Вусны" (1985), "Квадра" (1990). Пазней, працуючы ў Паставах, ён удзельнічаў у дзейнасці літаб'яднання "Світанак", выступаючы з вершамі на старонках раённай газеты "Пастаўскі край" і ў зборніках пастаўскіх літаратараў "Рунь". Шэраг твораў надрукавана ў рэспубліканскім перыядычным друку, у літаратурным альманаху "Дзень Паэзіі".

Яшчэ ў "Квадры" Лёня заявіў пра сябе як пра вельмі перспектыўнага паэта, які добра валодае музыкай і інтанацыяй вершаў, знаходзіць цікавыя вобразы і параўнанні, здольны ўбачыць нечаканае ў, здавалася б, звычайных штодзённых з'явах. Як прыгожа, сапраўды паэтычна гучыць пачатак верша:

Знерухомела ноч і прыспала лугі,
Рака разбухмаціла ніцыя лозы.
З небакраем зліліся лясоў берагі,
І сена расее да раніцы ў возе.

Нямала цікавых вершаваных радкоў Лёні Трубача можна было б прывесці для пацвярджэння адметнасці і своеасаблівасці яго паэтычнага голасу, але абмяжуюся яшчэ адным:

Непадобная ты на змяркання часіну,
Параўнаць не магу цябе з ветрыкам я.
Усміхнулася мне па-над хваляю сіняй,
Запляла ў валасы песню-спеў салаўя.

І ўсё ж, перачытваючы вершы Леаніда Трубача, лаўлю сябе на думцы, што мала, крыўдна мала пакінуў ён сабе твораў. Сапраўды, неяк падсвядома ўсё чакаў ад Лёні большага: вось, з'явяцца салідныя падборкі ў часопісах, вось, ён выдасць зборнік сваіх вершаў... Час ішоў, а чаканне так і заставалася чаканнем. Некалькі разоў мы заводзілі размову пра выданне яго кнігі, але Лёня ставіўся да такой перспектывы скептычна ды спасылаўся на "некалі потым". Зараз можна толькі разважаць над тым, вылучаючы розныя версіі, чаму чалавек, які меў несумненны паэтычны талент, так і не рэалізаваў яго напоўніцу. Лёня з задавальненнем пісаў сцэнарыі да розных святаў, вершы "на патрэбу дня", займаўся з вучнямі-пачаткоўцамі, якія наведвалі літаратурны гурток, якім ён кіраваў, а вось да сур'ёзнай паэзіі чамусьці звяртаўся рэдка.

У кожнага чалавека жыццёвы вопыт, выхаванне, адукацыя ствараюць пэўную сістэму каштоўнасцяў, падпарадкоўваючыся якім ён

дзейнічае, стварае, змяняе вакольны свет. Была такая свая сістэма і ў Леаніда Трубача. І была яна амаль поўнасцю правільная, бо ўвасабляла найлепшыя якасці беларуса-патрыёта, настаўніка-грамадзяніна, мужчыны-сем'яніна, чалавека-творцы. Шкада, што лёс не даў Часу... І гэта ён прадчуваў...

Закружыліся думкі завейныя,
Далячынь паміж намі ляжыць,
А масты не заўсёды надзейныя,
І так хочацца болей пражыць.
Закружыліся думкі завейныя,
Далячынь паміж намі ляжыць.
Вы не дзьміце, вятры сухавейныя,
Час і так вельмі хутка бяжыць!

## Змест

Сяргей Чыгрын. Зерне збіраўся сеяць вясной
**Вершы**
Узбоч дарогі — толькі камяні...
Закружыліся думкі завейныя...
Санет
Гавары па-беларуску, чалавек...
Разыходзяцца лёсы, а межы...
Настаўніцы роднай мовы
Туман схаваў цнатлівасць мокрых дрэў...
Трыялеты
Хата
Акравершы
Вясковая хата
Дзверы
Здаецца, дзень пражыты недарэмна...
Снег
Дзеясловы
Арэлі
Бяда гукнулася па хатах...
Касмічныя вышыні невычэрпнага кахання...
Мне — семнаццаць!
У жыцці сустракаюцца ўсе...
Я памыляўся цяжка неаднойчы...
Секунда, мінута, гадзіна, дзень...
Слёзы
Сустрэча
Як жывеш ты, мая лятуценніца...
Знерухомела ноч і прыспала лугі...
Усё. Зіма і заўсёды свята...
Падары мне надзею такую...
Зімой
Першая школа ў Паставах
На могілках
Матуліны вочы
Дзве галавы

Пачатак 90-х
Адышоў чалавек — прамільгнула і зорка...
Крокі
Кляновы ліст ляціць адзін да долу...
Бярозкам холадна ўвосень...
Жанчына ціха плакала ўначы...
Як сумуе жанчына, не трэба...
Нам засціць вочы пыл стагоддзяў...
Дождж
У дарозе
Асаблівасць вясновага ззяння...
Вясёлы час, трывожны час...
Чужой бяды ніколі не бывае...
Непадобная ты на змяркання часіну...
У Карэліі
На Белым моры
Ламбушка
На вывазцы лесу
Імгненні
Барвовым полымем абпаліць боль...
Хацеў бы верыць у рамонкаў таямніцы...
Дзве вясны
Успамін ветэрана
Галбяіца
У самалёце
Не чапайце апалае лісце...

**Сцэнарыі**
Мядзелка-рачушка
Пяю маю Айчыну
Запрашаем у Паставы
Гуканне вясны
Фальклорнае свята "Юр'я"
Вечар беларускага гумару "Смяяцца не грэх..."

**У вянок Леаніду Трубачу**
Таццяна Трубач. Памяці таты
Ігар Пракаповіч. Развітанне
Мікола Хаўстовіч. Ты годна нёс сваю беларускасць
Як крыштальная кропля расы...
Ігар Пракаповіч. Лёс не даў часу

Літаратурна-мастацкае выданне
Трубач Леанід Мікалаевіч
**Паміж песняй і болем**
Выбраныя творы
Адказны за выпуск Генадзь Вінярскі
Рэдактар Сяргей Чыгрын
Камп'ютэрны набор Сяргея Чыгрына
Фармат 70х100 1/32
Наклад 200 ас.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год